

ЗАКЛАДНАЯ ТКАЦКАЯ ТЭХНІКА ВЁСКІ СЕМЕЖАВА

ЧЫРВОНКА

ХАРЧАВАЦЦА ПРАВІЛЬНА... ЗА 900 РУБЛЁЎ У МЕСЯЦ 11



Выдаецца з 9 чэрвеня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

9 СНЕЖНЯ 2021 г. ЧАЦВЕР № 238 (29607)

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Людміла НІЖЭВІЧ, старшыня Пастаяннай камісіі па бюджэце і фінансах Палаты прадстаўнікоў:**

*«Малы і сярэдні бізнес — адзін з фактараў эканамічнага росту ў любой дзяржаве. Яго роля незаменная пры вырашэнні найбольш вострых эканамічных і сацыяльных задач. Ён садзейнічае фарміраванню здаровага канкурэнтнага асяроддзя, устанаўленню рынкавай раўнавагі, стварэнню новых рабочых месцаў, фарміраванню сярэдняга класа, задавальненню розных патрэбнасцяў насельніцтва, што ў рэшце рэшт прыводзіць да забеспячэння ўстойлівага эканамічнага росту. У Беларусі падтрымцы прадпрымальніцтва ў апошнія дзесяцігоддзе ўдзяляецца вялікая ўвага, прыняты шэраг праграм для яго стымулявання і развіцця, створаны прэферэнцыйныя ўмовы для вядзення бізнесу».*

# Карнавал — будзе!



Фота БелТА.

У Віцебскім дзяржаўным індустрыяльна-тэхналагічным каледжы распрацавалі і пачалі шыць спецыяльныя ахоўныя маскі, якія будуць насіць удзельнікі абласнога карнавальнага балю. Акрамя таго, тут рыхтуюць да афармлення фотазоны карнавалу і шыюць навагоднія сувеніры. На здымку: Маргарыта ВІНАКУРАВА за работай.

Размова па сутнасці

## Феномен Максіма Багдановіча

«Я ж кажу вам: добра быць коласам; але шчаслівы той, каму дадзена быць васільком. Бо нашто каласы, калі няма васількоў?»



Дом, у якім нарадзіўся Максім Багдановіч.

Так калісьці пісаў Максім Багдановіч пра лёс паэта. Яму было дадзена стаць паэтам, прыгожым беларускім васільком, які чыстаю красою сваіх вершаў даводзіць харастводзіць беларускай культуры і багацце душы беларускага народа.

СТАР. 12

Кантэкст

## ПА ПРЫНЦЫПЕ СІМЕТРЫІ

### Наша краіна ўвяла харчовае эмбарга

**Уведзены чарговы пакет санкцый супраць Беларусі не аказаў таго ўплыву, на які, мабыць, разлічвалі яго складальнікі. Наша краіна адрэагавала на гэтыя меры адэкватна. Урад павінен займацца выпрацоўкай антысанкцыйных мер без цяганіны, дакладна і павайсковаму. Аб гэтым Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка днямі заявіў на нарадзе па сацыяльна-эканамічным развіцці краіны. Кіраўнік дзяржавы заўважыў, што Беларусь не ўпершыню сутыкнулася з санкцыйным націскам. Больш за тое, у краіне да гэтага рыхтаваліся як мінімум паўгода, і ва ўрадзе існуе так званы антыкрызісны штаб. У той жа час Прэзідэнт адзначыў, што пакуль у краіне здолелі захаваць эканамічны рост і не дапусціць пераносу большасці праблем на паўсядзённае жыццё людзей. Па выніках нарады ў кіраўніка дзяржавы прэм'ер-міністр Раман Галоўчанка заявіў, што Беларусь у найбліжэйшыя дні прыме сіметрычны адказ. Сказана — зроблена.**

СТАР. 3

## КОРАТКА

- **Новую модульную пагранзаставу адкрылі ў Маларыцкім раёне на граніцы з Украінай.**
- Выстава «Процідзеянне карупцыі» адкрылася ў НББ.
- **Першыя ёлачныя кірмашы запрацуюць у Беларусі 18 снежня.**



- Стагоддзе Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі ўнеслі ў спіс памятных дат ЮНЕСКА.

ISSN 1990 — 763X

21238>

9 771990 763008

**Кожны дзень – са «Звяздой»!**

**Усім, хто падпісаўся на I квартал або I паўгоддзе 2022 года, — у падарунак чатыры календары — маляўнічы насценны, рэлігійны, народны і месяцавы**



Парламенцкі дзённік

# АХОВА ГРАНІЦЫ, АДКАЗ НА САНКЦЫІ І ЎЗДЗЕЯННЕ НА «ПРАФЕСІЙНЫХ СКАРЖНІКАЎ»

## Якія пытанні разглядаліся на пасяджэнні шостай сесіі Палаты прадстаўнікоў

**Дэпутаты ў першым чытанні прынялі змяненні ў Закон «Аб унутраных войсках». Абнаўленне дазволіць палепшыць магчымасці прымянення сродкаў і сіл гэтага роду войскаў для абароны дзяржавы, расказаў Яўген ЗАЙЦАЎ, член Пастаяннай камісіі па нацыянальнай бяспецы Палаты прадстаўнікоў. Як заявіў міністр унутраных спраў Іван КУБРАКОЎ, прадстаўляючы законапраект, неабходнасць удасканалення акта выклікана прымяненнем сіл і сродкаў МУС у постэлектаральны перыяд і рэгуляваннем пытанняў па абароне атамнай электрастанцыі.**

Так, да асноўных задач унутраных войскаў будзе адносіцца ўдзел у ахове грамадскага парадку, забеспячэнне бяспекі ахоўваемых асоб, аб'ектаў, прававога рэжыму ў зоне правядзення контртэрарыстычных мерапрыемстваў, узмацненне Дзяржграніцы.

«Унутраныя войскі ўжо нясуць службу на граніцы з Польшчай і Літвой па ахове грамадскага парадку і недапушчэнні правакацый на граніцы. Артыкул 9 Закона аб Дзяржаўнай граніцы дазваляе выконваць гэтыя задачы ўнутраным войскам. Што датычыцца паўнамоцтваў, якімі будуць надзеленыя ваеннаслужачыя органаў унутраных спраў, яны будуць такія ж, як і ў ваеннаслужачых пагранвойскаў», — акцэнтуе ўвагу Іван Кубракоў.

Законапраект дае права МУС устанаўліваць крытэрыі адбору прызыўнікоў ва ўнутраныя войскі. Такім чынам, у кандыдата не павінна быць фактаў прыцягнення да крымінальнай і адміністрацыйнай адказнасці па пэўных артыкулах. Як падкрэслівае міністр, крытэрыі адбору да прызыўнікоў будуць такія ж, як і да супрацоўнікаў унутраных органаў.

Дэпутаты ў першым чытанні прынялі і Закон «Аб зваротах грамадзян і юрыдычных асоб». Пра навацыі расказала **Наталля ТАРАСЕНКА, член Пастаяннай камісіі па правах чалавека, нацыянальных адносінах і СМІ Палаты прадстаўнікоў.** Для спрашчэння падачы электронных заяў створаны адмысловы сайт, а кожны зварот зарэгіструецца ў аўтаматызаванай сістэме і асабістым кабінеце заяўніка. Такім чынам, кожны грамадзянін зможа адсочваць ход работы над яго зваротам у рэжыме анлайн. Абмяркоўваецца пытанне аб захаванні Кнігі заўваг і прапаноў у індывідуальных прадпрымальнікаў і арганізацыях па аказанні паслуг насельніцтву. У абноўленым законе таксама ўдакладняць пералік прычын адмовы ў асабістым прыёме.

«Навацыі дапамогуць зрабіць закон больш дзейсным і якасным, даступным і зразумелым», — сцвярджае парламентарый.

Законапраект выклікаў дыскусію сярод дэпутацкай супольнасці, асабліва ў пытанні ўздзеяння на так званых прафесійных скаржнікаў. Для прадухілення з'явы парламентарыі прыйшлі да рашэння выпрацаваць алгарытм работы з гэтай катэгорыяй грамадзян да другога чытання закона.

Ратыфікавалі дэпутаты таксама міжурадавае пагадненне Беларусі і Расіі аб перавозцы айчынных нафтапрадуктаў праз марскія порты Расіі ў трэція краіны. Яно будзе дзейнічаць да канца 2023 года і прадугледжвае аб'ёмы звыш дзесяці мільёнаў тон. Па словах **Сяргея СЦЕЛЬМАШКА, члена Пастаяннай камісіі па бюджэце і фінансах Палаты прадстаўнікоў,** дадзенае пагадненне таксама з'яўляецца адказам Беларусі на санкцыі.

«І Брусель, і Вашынгтон павінны ведаць, што ніякія палітычныя, эканамічныя санкцыі, тым больш ваенныя крокі, на нас не падзейнічаюць і не дадуць ім чаканага эфекту», — заўважыў парламентарый.

Ён адзначыў, што эканамічныя абмежаванні — добры штуршок для развіцця экспарту ў прамысловасці, сельскай гаспадарцы і пераарыентавання гандлю на рынкі Блізкага, Сярэдняга Усходу, Афрыкі, Лацінскай Амерыкі.

Як дадаў **Дзяніс КАРАСЬ, член Пастаяннай камісіі па прамысловасці, паліўна-энергетычным комплексе, транспарце і сувязі Палаты прадстаўнікоў,** пагадненне аб перавозцы таксама спрыяе далейшаму ўдасканаленню адносін Беларусі і Расіі, дазваляе развіваць марскі паўночны напрамак Расіі і забяспечвае бесперабойную работу нашых нафтаперапрацоўчых прадпрыемстваў.

«Мы павінны адказваць. Пэўныя дзеянні з боку калектыўнага Захаду павінны жорстка перапыняцца. Меры ў адказ, што ўведзены ўрадам, дарэчныя і прымусяць урады заходніх краін да разважнасці», — сказаў парламентарый.

Таксама Палата прадстаўнікоў прыняла ў другім чытанні законапраекты аб нагляднальнай дзейнасці, інвестыцыях і ратыфікавала некалькі пагадненняў.

**Марыя ДАДАЛКА.**

Бяспека

# Праваахоўны блок поўнасцю кантралюе абстаноўку ў краіне

**Аб гэтым заявіў генеральны пракурор Андрэй ШВЕД перад рэспубліканскай каардынацыйнай нарадай па барацьбе са злачыннасцю і карупцыяй, якая прайшла ў Беларускім дзяржаўным музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, паведаміла БелТА.**

«Мы адзначаем аб'ектыўна: грамадская бяспека на вуліцах забяспечана. Любыя праявы экстрэмізму і тэрарызму будуць спыняцца, вінаватыя будуць пакараны», — сказаў Андрэй Швед. Разам з тым, паводле яго слоў, неабходна ўдасканальваць эфектыўнасць дадзенай работы. «Сёння мы бачым рэзервы, фіксуем, што апошнім часам стала больш праяўляцца актыўнасць праваахоўнікаў па выяўленні злачынстваў, учыненых раней. Усё часцей прыцягваюцца людзі, якія думалі, што яны ніколі не паўстануць перад судом. Гэтая тэндэнцыя павінна быць толькі ўзмоцнена. Асноўная задача — забяспечыць прыцягненне да адказнасці кожнага, хто зрабіў замах на грамадскі лад і бяспеку нашай дзяржавы», — дадаў генпракурор.

Кажучы аб рэцыдыўнай злачыннасці, Андрэй Швед нагадаў аб даручэнні Прэзідэнта трымаць згаданае пытанне на пастаянным кантролі. «Узровень рэцыдыўнай злачыннасці крыху знізіўся. Аднак нас вельмі непакоіць, што чвэрць такіх цяжкіх злачынстваў, як забойствы, нанясенне цялесных пашкоджанняў, згвалтаванні, здзейснена людзьмі, якія раней прыцягваліся да крымінальнай адказнасці. Асабліва заклапочанасць выклікае той факт, што, нягледзячы на вялікую колькасць забраніраваных рабочых месцаў, фіксуецца нізкая эфектыўнасць па працаўладкаванні гэтай катэгорыі нашых грамадзян. Больш за 70 працэнтаў з іх (тых, хто здзейсніў паўторнае злачынства) нідзе не працуюць і не занятыя. Стаіць задача ў тым ліку знайсці рэзервы, скаардынаваць работу ўсіх дзяржаўных органаў, каб людзі, якія адбылі пакаранне, былі неадкладна ўключаны ў грамадска карысную справу», — звярнуў увагу Андрэй Швед.

Як канстатавалі ў Генпракуратуры, у выніку рэалізацыі комплексу мер суб'ектамі прафілактыкі правапарушэнняў колькасць зарэгістраваных у краіне за 9 месяцаў гэтага года злачынстваў, здзейсненых людзьмі, якія маюць непагашаную і нязнятую судзімасць, у параўнанні з аналагічным перыядам 2020 года нязначна зменшылася (з 15 728 да 14 933), у той час як удзельная вага засталася на тым жа ўзроўні — 41,6 працэнта. У ходзе праверак пракуроры выявілі недахопы па лініі процідзеяння рэцыдыўнай злачыннасці.

У ведамстве дадалі: працаўладкаванню людзей, якія вызваліліся з месцаў пазбаўлення волі, не ўдзялялася належная ўвага, работа дзяржорганаў у гэтым напрамку не заўсёды была эфектыўная. У той жа час прыняты меры па ліквідацыі адзначаных кіраўніком дзяржавы недахопаў. Палепшылася ўзаемадзеянне праваахоўных органаў на стадыі распачынання крымінальнай справы, зменшылася колькасць выпадкаў прад'яўлення дзяржабвінаваўцамі новага абвінавачання і прад'яўлення імі хадайніцтваў аб прыпыненні судовага разбору для збору дадатковых доказаў. Акрамя таго, скарацілася колькасць скаргаў, якія паступаюць у органы пракуратуры, на парушэнні пры правядзенні аператыўна-вышуковых мерапрыемстваў і ў ходзе крымінальнага працэсу. Дзейнасць органаў крымінальнага праследавання на стадыі дасудовага справаводства па-ранейшаму знаходзіцца пад пільнай увагай пракурораў.

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## Больш за дзве гадзіны працягнуліся перагаворы Пуціна і Байдэна па тэлемосце

**Перагаворы прэзідэнта Расіі Уладзіміра Пуціна і прэзідэнта ЗША Джо Байдэна па тэлемосце працягнуліся крыху больш за дзве гадзіны.**

Пуцін выйшаў на сувязь з амерыканскім калегам са сваёй рэзідэнцыі ў Сочы. Размова праходзіла за зачыненымі дзвярыма па абароненай лініі відэасувязі, прызначанай для зносін кіраўніцтва дзвюх краін. Яна выкарыстоўваецца ўпершыню. Пераклад здзяйсняўся паслядоўны.

У пачатку сустрэчы прэзідэнты абмяняліся прывітаннямі. Байдэн, першым узяўшы слова, выказаў надзею на вочную гутарку з Пуціным у будучыні.

Гэтая размова двух лідараў — пятая з моманту ўступлення Байдэна на пасаду амерыканскага прэзідэнта. Раней кіраўнікі дзвюх дзяржаў тройчы размаўлялі па тэлефоне, а ў сярэдзіне чэрвеня яны правялі ў Жэневе вочную сустрэчу.

На парадку дня былі сітуацыя вакол Украіны і тэма прасоўвання НАТА на ўсход, стратэгічная стабільнасць і двухбаковыя пытанні. Чакалася, што лідары могуць закрануць і тэмы рэгіянальнай бяспекі, у тым ліку абстаноўку ў Афганістане.

## Олаф Шольц абраны федэральным канцлерам Германіі

**Член Сацыял-дэмакратычнай партыі Германіі Олаф Шольц афіцыйна абраны федэральным канцлерам Германіі, за яго прагаласавалі 395 членаў германскага парламента, Бундэстага.**




Спачатку Шольц адправіўся ў афіцыйную рэзідэнцыю прэзідэнта Германіі — палац Бельвю, дзе Франк-Вальтэр Штайнмаер, паводле канстытуцыі, афіцыйна прызначыў Шольца федэральным канцлерам. Пасля ён вярнуўся ў Бундэстаг для прынясення прысягі.

Новы ўрад Германіі сфарміруюць тры палітычныя сілы: Сацыял-дэмакратычная партыя Германіі (СДПГ), лібералы са Свабоднай дэмакратычнай партыі (СвДП) і партыя «Саюз-90/Зялёныя». У ФРГ іх кааліцыю называюць «святлафорам» — па партыйных колерах яе ўдзельнікаў.

## Касманаўт-карэспандэнт ТАСС і два японскія турысты адправіліся на МКС

**Ракета-носьбіт «Саюз-2.1а» з пілатуемым караблём «Саюз МС-20» стартавала ўчора з касмадрома «Байканур», паведамляе ТАСС.**



На «Саюзе МС-20» на МКС адправіліся касманаўт Аляксандр Місуркін, японскі мільярдэр Юсаку Маэдзава і яго памочнік па бізнесе Ёдзо Хірана. Яны правядуць на борце станцыі 12 сутак і вернуцца на Зямлю раніцай 20 снежня.

На борце МКС турысты будуць удзельнічаць у навуковай праграме, а таксама выконваць заданні ад карыстальнікаў інтэрнэту са спіса 100 things you want MZ to in space!, здымаць гэта на камеру і выкладваць на YouTube. На станцыю даставяць навагоднія падарункі для расійскіх членаў экіпажа, рэквізіт для заданняў, а таксама ядомыя сувеніры — адаптаваныя для ўжывання ў космасе стравы японскай кухні.

ТАСС і «Раскосмас» падпісалі 17 лістапада мемарандум аб супрацоўніцтве, які мае на ўвазе стварэнне карпункта агенцтва на Міжнароднай касмічнай станцыі. Першым карэспандэнтам ТАСС на арбіце стане Герой Расіі касманаўт «Раскосмаса» Аляксандр Місуркін. Ён будзе расказваць пра жыццё і работу на станцыі, яго навіны можна будзе прачытаць на інфармацыйных рэсурсах агенцтва, а фатаграфіі і відэа — паглядзець на сайце і афіцыйных старонках у сацыяльных сетках.

Падрабязнасці

# РАЗГЛЕДЖАНА ЗВЫШ 1300 ЗАЯЎ НА АТРЫМАННЕ БЕЛАРУСКАГА ГРАМАДЗЯНСТВА

**Дэпартамент па грамадзянстве і міграцыі Міністэрства ўнутраных спраў з сярэдзіны жніўня прыняў на разгляд 1322 заявы ад іншаземцаў на атрыманне беларускага грамадзянства, паведамілі ў МУС.**

Падчас «Вялікай размовы» кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка даручыў да канца бягучага года прапрацаваць пытанне аб прадастаўленні грамадзянства Беларусі замежным грамадзянам, якія пражываюць і ажыццяўляюць працоўную дзейнасць на тэрыторыі нашай краіны. «Прэзідэнт даручыў спрасціць працэдуру натуралізацыі гэтай катэгорыі асоб і ў паскораным парадку разгледзець адпаведныя хадайніцтвы замежных грамадзян, якія пажадалі інтэгравацца ў беларускае грамадства», — адзначыў **начальнік Дэпартамента па грамадзянстве і міграцыі МУС Аляксей БЯГУН.**

Пачынаючы з сярэдзіны жніўня супрацоўнікі падраздзяленняў па грамадзянстве і міграцыі органаў унутраных спраў правялі каля 4 тысяч кансультацый.

Па выніках разгляду зваротаў беларускае грамадзянства атрымала больш за 1,2 тысячы чалавек, якія прыбылі з Украіны. Указамі Прэзідэнта з іх прынята ў грамадзянства Рэспублікі Беларусь 796 асоб, а ў рамках выканання даручэння кіраўніка дзяржавы органы ўнутраных спраў афармілі рашэнні аб прадастаўленні беларускага грамадзянства 485 грамадзянам Украіны. «Гэта законапаслухмяныя сем'і, якія працаўладкаваны, вядуць добрапрыстойны лад жыцця, працуюць на карысць краіны і ўжо ўліліся ў наша грамадства», — падкрэсліў Аляксей Бягун.

У дэпартаменце звярнулі ўвагу, што работа па выкананні даручэння Прэзідэнта працягваецца.

**Пётр ДУНЬКО.**

**Калектыў Міністэрства антыманапольнага рэгулявання і гандлю Рэспублікі Беларусь смуткуе ў сувязі са смерцю Барыса Уладзіміравіча КРЫЦКАГА. Выказваем спачуванне родным і блізкім Б. У. Крыцкага ў сувязі з горам, якое іх напаткала, і падзяляем іх смутак.**

Кантэкст

# ПА ПРЫНЦЫПЕ СІМЕТРЫІ

## Наша краіна ўвяла харчовае эмбарга

### Супраць недружалюбных

Беларусь з 1 студзеня ў адказ на санкцыі ўводзіць харчовае эмбарга на шэраг тавараў з дзяржаў, якія ажыццяўляюць недружалюбныя дзеянні ў адносінах да нашай краіны. Аб гэтым паведамілі БелТА ў прэс-службе ўрада, каментуючы пастанову Савета Міністраў ад 6 снежня «Аб прымяненні спецыяльных мер адносна асобных відаў тавараў».

Толькі за 10 месяцаў 2021 года Беларусь імпартавала з такіх краін харчовых тавараў і прадуктаў харчавання на агульную суму, большую за $530 млн. Пазіцыі, якія фарміруюць аснову гэтага імпарту, з пачатку наступнага года будуць пад забаронай.

Табу на ўвоз распаўсюджваецца на шэраг тавараў з Еўрапейскага саюза і яго дзяржаў-членаў, Злучаных Штатаў Амерыкі, Канады, Нарвегіі, Албаніі, Ісландыі, Паўночнай Македоніі, Злучанага Каралеўства Вялікабрытаніі і Паўночнай Ірландыі, Чарнагорыі, Швейцарыі.

У пераліку забароненых тавараў — свініна, мяса буйной рагатай жывёлы, свініна, шэраг субпрадуктаў, мяса салёнае, у расоле, сушанае або вэнджанае, харчовая мука з мяса або мясных субпрадуктаў, малако і малочная прадукцыя (з некаторымі выключэннямі), агародніна, акрамя прызначанай для сяўбы, фрукты і арэхі, тлушч свіны і тлушч свойскай птушкі, тлушч буйной рагатай жывёлы, авечак або коз, лярд-стэарын і іншыя жывёльныя маслы, каўбасы і аналагічныя прадукты, кандытарскія вырабы, соль і іншыя тавары.

«Найважнейшым прыярытэтам для Беларусі па-ранейшаму застаюцца інтарэсы сваіх грамадзян. Кіраўнік дзяржавы неаднаразова арыентаваў на прыняцце мер у адказ без шкоды для насельніцтва. Па гэтай прычыне пастанова Савета Міністраў змяшчае шэраг выключэнняў і, у прыватнасці, не закране тавары, якія ўвозяцца беларусамі для асабістага спажывання, а таксама, напрыклад, прызначаныя для дзіцячага харчавання, і шэраг іншых пазіцый крытычнага імпарту», — звярнулі ўвагу ў прэс-службе.

Адначасова будуць прыняты меры па забеспячэнні збалансаванасці на спажывецкім рынку, у тым ліку за кошт яго насычэння прадукцыяй айчыннай вытворчасці. Імпарцёры, таваравытворцы і гандлёвыя сеткі будуць арыентаваны на замяшчэнне тавараў, якія не вырабляюцца ў Беларусі, пастаўкамі з дружалюбных дзяржаў.

У выпадку далейшых дэструктыўных дзеянняў адносна нашай краіны Беларусь захоўвае за сабой права пашырыць пералік забароненых таварных пазіцый. Таксама зацверджана палажэнне аб кватаванні ўвозу на нашу тэрыторыю асобных відаў тавараў.

### Пакупнікі не адчуюць

Харчовае эмбарга не адчуюць пакупнікі. Такое меркаванне выказаў міністр антыманапольнага рэгулявання і гандлю Уладзімір Калтовіч. «Прычына прыняцця названай пастановы — санкцыйны ціск на Беларусь, і, па сутнасці, гэта з'яўляецца вымушанай мерай. На жаль, нам даводзіцца рэагаваць і спрабаваць рэагаваць адэкватна. У сувязі з гэтым пасля прыняцця пятага пакета санкцый урадам было прынята такое рашэнне. Дастаткова шырока праведзены кансультацыі з дзяржаўнымі органамі аб асобных групах тавараў, якія ўвозяцца з такіх краін. Гэта больш за 20 груп прадукцыі. Туды ўваходзяць тавары, якія выкарыстоўваюцца як для вытворчасці, так і для рэалізацыі ў рознічнай гандлёвай сетцы», — расказаў Уладзімір Калтовіч.

Паводле яго слоў, гэтыя вырабы ўмоўна можна падзяліць на тры катэгорыі. «Тавары, якія поўнасцю замяшчаюцца за кошт айчынных вытворцаў або вытворчасцяў, размешчаных у краінах, што з'яўляюцца дружалюбнымі для Беларусі. Тавары, якія выпрабляюцца, але не ў дастатковай колькасці, і тавары так званага крытычнага імпарту», — адзначыў міністр.

Уладзімір Калтовіч дадаў, што пастановай прадугледжаны шэраг выключэнняў. «Для чаго гэта зроблена? У сувязі з тым, што мы маем тавары крытычнага імпарту ў гэтым пераліку, будуць створаны кампенсацыйныя механізмы па пераарыентацыі пастаўшчыкоў на іншыя краіны або ўвозе такіх тавараў з дружалюбных краін. У сувязі з гэтым мы спадзяёмся, што такія меры не адчуюць пакупнікі. Акрамя таго, яны не распаўсюджваюцца на тавары, увезеныя для асабістага спажывання, тавары, якія выкарыстоўваюцца ў вытворчасці лекавых сродкаў, дзіцячага харчавання, якія рэалізоўваюцца ў гандлёвай сетцы для дзіцячага харчавання, і гэтак далей, — растлумачыў міністр. — Таму думаю, што гэта мера кропкавая і вельмі канкрэтная. Калі гаварыць аб суме, то Беларусь за 9 месяцаў імпартавала больш як на $2 млрд прадуктаў харчавання. Каля чвэрці тавараў у гэтым пераліку».

### Поўны асартымент

Унутраны рынак будзе забяспечаны харчаваннем, а прадпрыемствы — сыравінай. Аб гэтым заявіў намеснік міністра сельскай гаспадаркі і харчавання Беларусі Аляксей Багданаў. «Беларусь ужо даўно выбудоўвала палітыку па забеспячэнні харчовай бяспекі ўласнымі сіламі. Нам удалося гэтага дабіцца ўжо больш за 10 гадоў таму. Па мяса-малочнай групе тавараў мы сябе поўнасцю забяспечваем і маем значны экспартны патэнцыял. Напрыклад, вырабляючы амаль 8 мільёнаў тон малочнай прадукцыі ў год, мы экспартуем 4,8 мільёна тон на замежныя рынкі ў 58 краін свету. Гэта значыць, двайны запас і нават больш па малочнай прадукцыі. Такая ж сітуацыя з мясам: 32 працэнты ад агульнага аб'ёму вытворчасці — гэта экспартны патэнцыял. Таму запас вельмі вялікі», — сказаў Аляксей Багданаў.

Паводле яго слоў, амаль уся мясамалочная прадукцыя на паліцах айчыннай вытворчасці. «Гэтыя тавары нікуды не знікнуць, яны былі, ёсць і будуць. І толькі будуць пашырацца асартымент і аб'ём выпрабленай прадукцыі згодна з нашым планам. Спажывец не адчуе ніякіх змяненняў з пункту гледжання насычэння паліц», — падкрэсліў намеснік міністра.

Ён таксама закрануў тэму забеспячэння перапрацоўчых прадпрыемстваў сыравінай. «Мы маем квоты ў рамках ЕАЭС па свініне, мясе птушкі. Такія тавары ўвозім на 90 % з краін, якія не трапілі ў спіс», — заявіў Аляксей Багданаў. — Што да агародніны і садавіны, долля айчынных на паліцах — ад 60 працэнтаў да 90 працэнтаў у залежнасці ад віду. Вядома, у міжсезонне мы ўвозім частку агародніны і садавіны. Але тут таксама ніякіх праблем не чакаем. Многія тавары, якія завозіліся з ЕС, ішлі транзітам. Таму нашым камерцыйным структурам, якія займаюцца імпартам, неабходна хутка пераарыентавацца непасрэдна на вытворцаў. Магчыма, будзе нават танней, чым праз нейкага пасрэдніка, які быў раней у Еўропе. Канешне, гэта стане ў тым ліку імпульсам для нашых таваравытворцаў і інвестараў павялічыць аб'ёмы вытворчасці агародніны і садавіны ў нашай краіне, закласці новыя сады», — адзначыў намеснік міністра. Паводле яго слоў, харчовае эмбарга не паўплывае і на планы па экспарце. Экспарт беларускіх харчовых тавараў і сельскагаспадарчай сыравіны за студзень—кастрычнік 2021 года вырас на 14,1 працэнта, за мяжу пастаўлена тавараў на суму каля $5,4 млрд. Па выніках года чакаецца лічба больш як $6 млрд.

### Стаўка на імпартазамяшчэнне

Ва ўмовах санкцый трэба павялічваць лакалізацыю вытворчасці прадукцыі. Аб гэтым заявіў прэм'ер-міністр Беларусі Раман Галоўчанка на пасяджэнні ўрада. Ён канстатаваў станоўчыя тэндэнцыі ў рабоце па імпартазамяшчэнні. «Сальда знешняга гандлю таварамі ў рамках зацверджанай схемы імпартазамяшчэння за апошнія пяць гадоў палепшылася на $412 млн. Мінэканомікі адзначае, што паляпшэнне сітуацыі з сальда ў цэлым па краіне забяспечваецца за кошт вынікаў рэалізацыі планавых мер па імпартазамяшчэнні», — адзначыў прэм'ер-міністр.

Міністр эканомікі Аляксандр Чарвякоў назваў некалькі прапанаваных мер. Апроч лакалізацыі, гэта развіццё тэхналагічных ланцужкоў, перапрацоўка мясцовых сыравінных рэсурсаў, прыцягненне малога і сярэдняга бізнесу. Па меркаванні міністра, імпартазамяшчэнне набывае асаблівае значэнне як інструмент процідзеяння санкцыям. Ужо прапанавана каля 170 імпартазамяшчальных праектаў на агульную суму амаль Br13 млрд інвестыцый. «З гэтага пула мы выбралі 47 найбольш значных праектаў з аб'ёмам інвестыцый каля Br8 млрд. Гэтыя 47 праектаў дадуць нам магчымасць стварыць прадукцыі больш, як на $9 млрд імпартазамяшчэння», — адзначыў міністр. — Мы бачым, як неабходна развіваць імпартазамяшчэнне, і лічым, што новыя інструменты будуць матываваць работу нашых прадпрыемстваў у гэтай галіне».

**Пётр ДУНЬКО.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

### У тэму

## «Сяброў у нас шмат»

У Беларусі ёсць мабілізацыйныя планы на любы сцэнарый санкцыйнага ціску Захаду, які працягваецца. Аб гэтым у інтэрв'ю тэлеканалу «Беларусь 1» заявіў намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Дзмітрый Крутой. Ён адзначыў, што сёлета ў эканоміцы «больш ясных, сонечных дзён, цудоўныя вынікі». «Сапраўды, вельмі добрыя вынікі і ў сферы вытворчасці, і ў экспарце, і ў даходах, і ў занятасці. Таму па ўсіх ключавых базавых параметрах эканоміка сёлета працуе добра», — адзначыў Дзмітрый Крутой.

У цэлым па экспарце Дзмітрый Крутой падкрэсліў, што прыярытэт — 65 працэнтаў прыросту эканомікі ў наступным годзе — плануецца менавіта за кошт экспартных паставак. Тэмп росту экспарту павінен скласці 106,3 працэнта, або на $2,7 млрд больш, чым сёлета. Улады разлічваюць, што ў 2022 годзе таварны экспарт у Кітай вырасце на 32 працэнты або на $300 млн, у Расію — на 9,5 працэнта і ў Афрыку — на 52 працэнты.

«Так што ізаляваць нас не атрымаецца. Сяброў і партнёраў у нас шмат. Мы спадзяёмся, што ў рамках дыверсіфікацыі і пераарыентацыі экспартных патокаў нам удасца забяспечыць не толькі прырост (экспарту. — **Рэд.**) амаль $3 млрд, але і захаваць дадатнае сальда ў памеры $2,5 млрд. Гэта будзе пэўная стабілізацыя для нашага ўнутранага валютнага рынку», — адзначыў Дзмітрый Крутой.

Узровень

# ЛІЧБАВЫЯ ТЭХНАЛОГІІ І РОБАТЫ ЗАМЕСТ ЧАЛАВЕКА

## Найбуйнейшы лагістычны аператар краіны працягвае ўдасканальваць свае паслугі



**«Белмытсэрвіс» і «Белтэлекам» развіваюць супрацоўніцтва ў сферы інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій. Пагадненне аб партнёрскіх узаемаадносінах падпісана ўчора паміж прадпрыемствамі.**

Лічбавыя тэхналогіі сёння актыўна запатрабаваныя ў многіх галінах, і лагістыка — не выключэнне. Яны дазваляюць пашырыць узаемадзеянне з кліентамі па лічбавых каналах і знізіць затраты на абслугоўванне. Сярод праектаў, якія змогуць сумесна рэалізаваць прадпрыемствы, — відэа- і аўдыякантроль рабочых месцаў, што палепшыць якасць абслугоўвання кліентаў. Увогуле, паслуга «Відэакантроль» ад «Белтэлекама» ўжо паспяхова выкарыстоўваецца лагістычным аператарам. Цяпер ёсць магчымасць выпрабаваць дадатковы сэрвіс «Відэааналітыка», які дазваляе распазнаваць твары людзей і нумарныя знакі транспарту, падлічваць наведвальнікаў і машыны, што цікава для аналізу работы як складскіх памяшканняў, так і гандлёвых аб'ектаў. Павысіць бяспеку закліканы дэтэктары пакінутых прадметаў, дыму і агню, а таксама прадметаў, якія рухаюцца.



Як вядома, сёння ва ўсім свеце на дапамогу чалавеку прыходзяць робаты. Рабатызацыя складоў дазваляе нашмат павысіць эфектыўнасць: робаты і канвееры павышаюць хуткасць прыёмкі тавараў у 20—30 разоў, а адгрузкі — у 3-5 разоў. Пры гэтым павялічваецца і бяспечнасць працы — усе аперацыі, якія тояць небяспеку, можна даручыць робатам. Такім чынам, рабатызацыя і аўтаматызацыя складской інфраструктуры дазваляюць атрымаць на рынку лагістычных паслуг значныя канкурэнтныя перавагі.

— Мы пільна сочым за развіццём лічбавізацыі ў свеце і самі актыўна праводзім палітыку, заснаваную на пэўных стандартах, — адзначае **генеральны дырэктар РУП «Белмытсэрвіс» Вадзім БАБАРЫКІН.** — Сёння мы абмяркоўваем з «Белтэлекамам» развіццё стандарту 5G, які збіраемся выкарыстоўваць. Як вядома, Беларусь з'яўляецца той краінай, якая практыкуе эксперыменты па лічбавізацыі ў галіне транзітнага калідора, кантролю руху транспартных сродкаў на тэрыторыі краіны. Нам гэта важна, бо мы кансалідуем вялікія транспартныя патокі і абслугоўваем іх на нашых тэрміналах па ўсёй краіне.

Пагадненне надае імпульс не толькі ўдасканаленню і развіццю сувязі і тэлекамунікацыйных паслуг, але і аказанню мытных паслуг, аб'яднанню інтэлектуальных і творчых рэсурсаў, зніжэнню затрат.

— Мы маем магчымасць будаўніцтва і эксплуатацыі лакальных вылічальных сетак, што таксама актуальна для такога краінавага прадпрыемства, якім з'яўляецца «Белмытсэрвіс», — кажа **генеральны дырэктар РУП «Белтэлекам» Юрый ПЕТРУЧЭНЯ.** — Гэта дазваляе ліквідаваць прасторавую разгрупаванасць аб'ектаў — мы аб'ядноўваем прадпрыемства ў адно цэлае з дапамогай кутксных каналаў сувязі, якія належаць «Белтэлекаму».

Са свайго боку «Белтэлекам» збіраецца выкарыстоўваць і лагістычныя магчымасці «Белмытсэрвісу».

— Унікальнасць лагістычных рашэнняў выклікае цікавасць у нас як партнёраў «Белмытсэрвісу». Нашы контрагенты знаходзяцца па ўсім свеце, і пытанне лагістыкі сёння вельмі актуальнае. Падпісанае пагадненне дазваляе аб'яднаць наш кадравы і вытворчы патэнцыял дзеля рашэння надзённых задач, — рэзюмуе Юрый Петручэня.

**Алена КРАВЕЦ.**

Моцныя рэгіёнамі

Старшыня Лідскага райвыканкама Сяргей ЛОЖЭЧНІК:

# «У нас ёсць усё, што неабходна для жыцця»

## Неўзабаве ў Лідзе з'явяцца батанічны сад, пешаходная вуліца і сучасныя прышкольныя стадыёны

**Рэпутацыю буйнога прамысловага цэнтра Ліда набыла ўжо не адно дзесяцігоддзе таму. Прадукцыя, якая вырабляецца на мясцовых прадпрыемствах, на працягу многіх гадоў з'яўляецца не толькі брэндам краіны, але і добра вядомая за мяжой. Чым яшчэ славіцца рэгіён, на тэрыторыі якога знаходзіцца адзін з найпрыгажэйшых замкаў Беларусі і як у найбліжэйшы час ён будзе развівацца, карэспандэнту «Звязды» расказаў старшыня Лідскага райвыканкама Сяргей ЛОЖЭЧНІК.**



***— Сяргей Васільевіч, напрыканцы года прынята падводзіць вынікі. З якімі сацыяльна-эканамічнымі паказчыкамі завяршаеце 2021-ы?***

— Выкананыя ўсе асноўныя вытворча-эканамічныя паказчыкі, павялічваецца рэальны заробак. Гэта дазваляе дасягаць таго, на што накіравана сёння наша краіна. У эканоміцы рэгіёна задзейнічана 56 % насельніцтва. Штогадовыя дацыянальны накіраванасці, рэалізаваны ўсе планы, звязаныя з укладаннямі ў ахову здароўя, сістэму адукацыі. За гэты год у нас з'явіўся шэраг спартыўных аб'ектаў. Эканоміка, якая стабільна працуе, дазваляе жыць так, як плануем. Нас нішто не выбівае з каляіны.

***— Прыцягненне інвестыцый уплывае на развіццё эканомікі рэгіёна. Чым прываблівае інвестараў Лідчына?***

— Лідскі раён прывабны не толькі геаграфічным становішчам, але і тым, што на нашай тэрыторыі ёсць магчымасць ствараць прадпрыемствы ў свабоднай эканамічнай зоне. Увогуле, мы глядзім на інвестыцыйную прыцягальнасць больш шырока: гэта і працоўны патэнцыял, і сацыяльная інфраструктура горада — у нас ёсць усё, што неабходна для жыцця. Адзначу, што ў інвестыцыйным цыкле рэгіёна ўдзельную вагу (каля 35 %) займае прыватны бізнес. Мы сёння дыверсіфікуем рынкі збыту і больш актыўна асвойваем Кітайскую Народную Рэспубліку, Еўрасаюз і нават краіны Афрыкі. У нас шмат прадпрыемстваў са змешаным капіталам. Яны працуюць стабільна: не скарачаюць аб'ёмы вытворчасці, не аптымізуюць працоўныя калектывы, а толькі развіваюцца.

***— Як прадпрыемствам удаецца трымацца на плаве падчас сусветнага эканамічнага крызісу?***

— У прамысловым комплексе Лідскага раёна функцыянуюць 27 буйных вытворчасцяў і 83 прадпрыемствы з замежным капіталам. Прадукцыя экспартуецца ў 67 краін. Асноўнымі гандлёвымі партнёрамі з'яўляюцца Расійская Федэрацыя, Літва, Украіна, Польшча, Вялікабрытанія. Пашыраецца геаграфія экспарту: мы ўжо асвоілі рынкі Дамініканскай Рэспублікі, Конга, Іарданіі, Ірана, Емена, Новай Зеландыі і інш. Залог поспеху прадпрыемстваў — прафесіянальныя калектывы. Тыя ўмовы, якія створаны ў дзяржаве для работы, памножаныя на прафесіяналізм любога калектыву, даюць добрыя вынікі.

***— У Лідзе вельмі актыўна будуецца жыллё. З гэтай мэтай нават створаны новы мікрараён. Хто там будзе жыць і з якімі тэмпамі вядзецца будаўніцтва?***

— Будаўнічая галіна — драйвер для многіх іншых сфер жыццядзейнасці. Сёлета на жыллёвае будаўніцтва накіравана 57,3 млн інвестыцый. З пачатку года ў эксплуатацыю ўведзена 423 кватэры, забяспечана жыллём 232 шматдзетныя сям'і. Апошніх сёння практычна няма ў чарзе тых, хто мае патрэбу ў жыллі: сям'я, якая становіцца шматдзетнай, на працягу года атрымлівае дах над галавой. Актыўна ідзе будаўніцтва новага мікрараёна «Поўнач». Ён стане самым вялікім у горадзе: разлічаны на больш чым 33 тысячы жыхароў. Гэта будзе сучасны жылы комплекс: двары без заезду для аўтамабіляў, ліфты прадугледжаны нават у пяціпавярховіках, дзіцячы садок на 190 месцаў, школа з басейнам на 1020 месцаў. Поўнасцю ўвесці ў эксплуатацыю першы квартал мікрараёна, разлічаны на 7200 жыхароў, плануем у найбліжэйшую пяцігодку.

***— Лідскія медыкі ўсёй краіне паказалі, як змагацца з каранавіруснай інфекцыяй. Якая сітуацыя з пандэміяй сёння?***

— Дзякуючы санітарна-супрацьэпідэміялагічным мерапрыемствам, якія праводзяцца сярод насельніцтва, у тым ліку вакцынацыі супраць COVID-19, сітуацыя па захваральнасці ў раёне пайшла на спад з памяншэннем колькасці тых, хто захварэў, на 30 % штотыднёва. Вакцынацыяй супраць каранавіруснай інфекцыі ў раёне ахоплена больш чым 45 % насельніцтва. Сёння Лідская цэнтральная раённая бальніца з'яўляецца міжраённым цэнтрам, куды шпіталізуюць хворых на COVID-19 з найбліжэйшых раёнаў. Ложкавага фонду дастаткова. Больш за тое, да новага года пасля капітальнага рамонту ўвядуць у эксплуатацыю хірургічны корпус, у якім будзе ўсталявана сто дадатковых кіслародных пунктаў.

***— Сёння Ліда — яшчэ і адзін з турыстычных цэнтраў краіны...***

— І яго жамчужына — Лідскі замак. Аднак каб перастаць быць транзітным турыстычным горадам, нам яшчэ шмат чаго трэба зрабіць. Вакол замка плануем стварыць адпаведную інфраструктуру, каб пасля экскурсіі людзі ў нас паелі, а магчыма, і пераначавалі. У наступным годзе каля замка адкрыецца пешаходная вуліца, дзе размесцяцца зоны адпачынку, канцэртныя пляцоўкі, пад адкрытым небам будуць праводзіцца ўрокі музычнага каледжу. Над архітэктурным вырашэннем вуліцы ўжо працуюць студэнты Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Пушкіна. Адзначу, што ў нас сур'ёзна развіты і прамысловы турызм. Прадпрыемствы арганізоўваюць на сваіх тэрыторыях музеі, можна пабываць на вытворчасці, прадэгуставаць прадукцыю. Той жа шклозавод «Нёман» да пандэміі прымаў прыкладна 17,5 тысячы турыстаў за год.

***— Нам вядома, што па вашай ініцыятыве ў райцэнтры будзе створаны батанічны сад...***

— Ён размесціцца на плошчы ў 26 гектараў. Тут з'явяцца ландшафты, дарожкі, вадаёмы. Дапоўніць комплекс парковая зона: ужо высаджаны першыя алеі. Галоўным аб'ектам стане аранжарэя — чатырохпавярховы вітражны будынак у форме кветкі з раскрытымі лістамі. Унутры размесцяцца ярусы з экзатычнымі раслінамі, якімі адначасова змогуць любавацца 170 наведвальнікаў. На тэрыторыі батанічнага саду таксама прадугледжаны кафэ з тэрасай, кветкавая крама, вучэбна-адукацыйны цэнтр з канферэнц-залай. Пралічана эканамічная выгада: зелянгас зможа ладзіць экскурсіі, прадаваць расліны, праводзіць канферэнцыі, запрашаць у кафэ. Рэалізацыя плана па стварэнні ў Лідзе батанічнага саду дапаможа не толькі павялічыць турыстычную прывабнасць рэгіёна, але і захаваць калектыў вузкапрафесійных спецыялістаў службы зялёнай гаспадаркі Лідскага ЖКГ, прадухіліць закрыццё ўстановы.

***— Як высветлілася, Ліда — яшчэ і спартыўны горад...***

— Усё, што нам неабходна зрабіць, падказваюць людзі. Менавіта рэагуючы на запыт жыхароў горада, мы пабудавалі міні-футбольны манеж, у якім можна трэніравацца ў любое надвор'е. Адначасова з сацыяльнай сетцы звярнуліся падлеткі і папрасілі стварыць у Лідзе скейт-парк. Пытанне вывучылі — і неўзабаве такая пляцоўка з'явілася. Цяпер займаемся мадэрнізацыяй школьных стадыёнаў пад сучасныя спартыўныя аб'екты для школьнікаў і дарослых лідчан. Кожны прышкольны стадыён у перспектыве будзе разбіты на пляцоўкі: міні-футбольную, для гульнявых відаў спорту, пляцоўку па варкаўце і тую, якую пажадаюць мясцовыя жыхары. Першы крок ужо зроблены: стадыён школы № 16 атрымаў новае асвятленне, заасфальтаваную бегавую дарожку і спортпляцоўку. Мадэрнізацыя працягнецца. Школьнікам стала больш зручна займацца фізкультурай, а пасля ўрокаў на стадыён прыходзяць удасканальваць сваю фізічную форму мясцовыя жыхары. І гэта не можа не радаваць!

**Вераніка КАНЮТА.**

Свет навукі

# ЦІ БУДЗЕ АРХЕАЛАГІЧНЫ МУЗЕЙ У ВІЦЕБСКУ?

## Гэтае пытанне зноў паўстала падчас навуковай канферэнцыі «Віцебскія старажытнасці»

**Яна сёмы раз сабрала ў сталіцы Падзвінскага краю вучоных, краязнаўцаў, работнікаў музеяў, выдаўцоў з Беларусі і Расіі і гэтым разам была прысвечана 1000-годдзю першай згадкі Віцебска ў летапісах. Канферэнцыя праводзіцца Віцебскім абласным краязнаўчым музеем з 2009 года, за гэты час яна стала аўтарытэтным форумам не толькі ў краіне, але і за яе межамі.**



**На пастаяннай выстаўцы «Старажытны Віцебск».**

Адной з мэт, як растлумачылі журналістам арганізатары, з'яўляецца стварэнне ўмоў для навуковага прымянення вынікаў даследаванняў у розных галінах гісторыі, археалогіі, этнаграфіі, гісторыі мастацтваў і музейнай справы, звязаных з Віцебскай вобласцю і тэрыторыямі, якія некалі ўваходзілі ў склад дзяржаўных і адміністрацыйных утварэнняў Падзвіння. Тэматыка канферэнцыі мае шырокія храналагічныя рамкі — ад найстаражытных часоў засялення рэгіёна да 20-х гадоў XX стагоддзя.

Многія гісторыкі лагічна канстатуюць, што паміж акадэмічнай навукай, рэгіянальнымі ўніверсітэтамі, архівамі, музеямі і шырокім колам краязнаўцаў існуюць пэўныя межы. Матэрыялы па гісторыі краю захоўваюцца ў розных архівах Мінска, Літвы, Расіі, Польшчы, што ўскладняе ўмовы навуковых даследаванняў. І наадварот, даследчыкі па-за межамі Віцебскай вобласці не заўсёды цікавяцца вынікамі сваёй работы на месцах. Праведзенне канферэнцый дапамагае пераадольваць такія перашкоды і садзейнічае інтэнсіфікацыі даследаванняў па рэгіянальных пытаннях, міждысцыплінарнаму дыялогу, пашырэнню сувязяў паміж даследчыкамі і навуковымі ўстановамі.

У рамках сёлетняй канферэнцыі прагучала каля трыццаці дакладаў удзельнікаў з Масквы, Мінска, Віцебскай вобласці. Работы прысвечаны найноўшым археалагічным адкрыццям, старажытнай гісторыі Віцебска, музейным калекцыям, біяграфіям даследчыкаў рэгіёна А. М. Семянтоўскага, А. П. Сапунова.

Адбылося адкрыццё выстаўкі, прысвечанай 100-годдзю з дня нараджэння выдатнага гісторыка, археолага Л. В. Аляксеева, на якой былі прадстаўлены матэрыялы ягонай навуковай спадчыны. Гэты савецкі і расійскі гісторык і археолаг вельмі шмат зрабіў для нашай краіны, ён вядомы як пачынальнік даследаванняў тапаграфіі старажытнага Віцебска.

Адметна, што пасля заканчэння гістарычнага факультэта Маскоўскага дзяржаўнага ўніверсітэта з 1948 да 1950 года вучоны працаваў у Гродзенскім гісторыка-археалагічным музеі, з 1953-га — у Інстытуце археалогіі АН СССР. У 1954 годзе знайшоў у Ленінградскім архіве фотаплацінкі з выявай Крыжа Еўфрасінні Полацкай, па якіх была праведзена яго рэканструкцыя. У 1955 годзе абараніў кандыдацкую дысертацыю на тэму «Полацкая зямля ў IX—XIII стст.». У 1962—1966 гадах выкладаў археалогію ў Магілёўскім педінстытуце. У 1985-м абараніў доктарскую дысертацыю на тэму «Смаленская зямля ў IX—XIII стст.».

Падзеяй з вялікай літары стала і прэзентацыя новай манаграфіі Л. У. Калядзінскага «Верхні замак Віцебска (IX—XVIII стст.)», у якім вядомы беларускі археолаг падводзіць вынікі сваіх шматгадовых раскопак у горадзе на Заходняй Дзвіне. Ён нагадаў, дарэчы, што яшчэ ў 1980-м Савет Міністраў БССР прыняў пастанову аб стварэнні ў абласным цэнтры археалагічнага музея, які павінен быў знаходзіцца недалёка ад будынка Коласаўскага драматычнага тэатра. Над драўлянай забудовай узвялі падстрэшша, туды арганізоўвалі экскурсіі. На жаль, у 1990 годзе наземнае збудаванне разабралі, гістарычнае месца засыпалі. Але даследчык лічыць, што не ўсё так сумна, і калі добра лабіраваць пытанне стварэння археалагічнага музея ў Віцебску, можна рэалізаваць даўнюю ідэю.

У будынку ратушы ёсць пастаянна дзеючая археалагічная выстаўка «Старажытны Віцебск». Там можна даведацца гісторыю горада з дапамогай археалагічных знаходак (манеты, прылады працы, прадметы ўзбраення, шахматныя фігуркі, вырабы віцебскіх рамеснікаў, старажытныя прадметы культу) з перыяду ўзнікнення горада ў X стагоддзі да XIV стагоддзя — часоў далучэння да ВКЛ.

Магчымасць самім убачыць старажытныя будынкі пакідае асабліва ўражанне. Тым больш што, як было агучана на канферэнцыі, захаванасць знойдзенага дастаткова высокая.

Аднак жыхарам Віцебска ў гэтым пакуль даводзіцца зайздросціць брастаўчанам, бо ў Брэсце вясной 1982 года быў адкрыты доступ да гарадзішча. Хочацца верыць, што падобны раскоп з'явіцца і на поўначы краіны.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ, фота аўтара.**

# БЯСПРАЎЕ І НЕСПРАВЯДЛІВАСЦЬ

## Куды ўлады вядуць палякаў?




**Старшыня кіруючай кансерватыўнай партыі Польшчы «Права і справядлівасць» (ПіС), віцэ-прэм'ер, які курыруе сілавы блок, Яраслаў Качыньскі выказаўся наконт палітыкі Германіі. Яго словы прыводзіць выданне Wirtualna Polska. На пасяджэнні парламенцкага клуба Качыньскі сказаў, што «Германія хоча пабудаваць Чацвёрты рэйх». Палітык дадаў, што Польшча не дапусціць гэтага. Качыньскі заклікаў дэпутатаў мабілізавацца, падкрэсліўшы, што палітычная сітуацыя стала напружанай. Адзначаецца, што прысутныя былі здзіўлены моцнай заявай наконт Германіі, якая прагучала ў рамках каментарыя на тэму напружаных адносін паміж Варшавай і еўрапейскімі сталіцамі. На фоне, мякка кажучы, складаных узаемаадносін Польшчы і ЕС такія дэмаршы вельмі рызыкоўныя. Як лічаць аналітыкі, заява Качыньскага — камень у агарод польскай апазіцыі, якая апошнім часам згуртавалася і канструктыўна выступае супраць правальных дзеянняў улады. У Польшчы абвастрылася ўнутрыпалітычная барацьба, паглыбляецца раскол грамадства. Куды ўлады вядуць палякаў?**

### «Рэанімацыя» Рэчы Паспалітай

У 2015 годзе правая кансерватыўная партыя, якая абапіраецца на нацыяналістаў і заўзятых католікоў, «Права і справядлівасць», здолела перамагчы на выбарах і, стварыўшы кааліцыю «Аб'яднаныя правыя», стаць дэ-факта кіруючай. Пазней член гэтай палітычнай сілы Анджэй Дуда выйграў прэзідэнцкую гонку і ўзначаліў рэспубліку, умацаваўшы тым самым становішча правых кансерватараў. Дэкларуючы правядзенне «маральнай рэвалюцыі» ў Польшчы і нават «пераход ад Трэцяй Рэчы Паспалітай да Чацвёртай», «ПіС» адразу ўзяліся ажыццяўляць свае нацыянальна-кансерватыўныя ідэі на практыцы, заўважыла ukraina.ru.




Спачатку новае кіраўніцтва краіны прыняло скандальны закон аб СМІ, які дазволіў яму прызначыць на галоўны ў краіне дзяржаўны тэлеканал TVP лаяльных да партыі рэдактараў. Гэта выклікала хвалю абурэння ў Берліне і Брусэлі. У ЕС адразу заявілі, што новы закон аб СМІ ўстанаўлівае празмерна вялікі кантроль улады над польскімі сродкамі масавай інфармацыі. Шэраг нямецкіх палітыкаў, якія прадстаўляюць у Бундэстагу Хрысціянска-дэмакратычны саюз/Хрысціянска-сацыяльны саюз (ХДС/ХСС), тады нават прыгразілі ўвядзеннем санкцый супраць Варшавы. А старшыня Еўрапарламента Марцін Шульц тады падкрэсліў, што «еўрапейскае кіраўніцтва павінна аб'яднацца, каб выступіць супраць палітыкі, якую праводзіць кіраўніцтва Польшчы».

Але гэта быў толькі пачатак — праз год «ПіС» ініцыіравала яшчэ адну рэформу, гэтым разам судовую. Яе сутнасць заключаецца ў тым, што цяпер суддзяў могуць прыцягваць да дысцыплінарнай адказнасці або нават звальняць за дзеянні, калі Дысцыплінарная палата палічыць, што яны «ствараюць перашкоды функцыянаванню судовай сістэмы». Акрамя таго, Міністэрства юстыцыі атрымала паўнамоцтвы прызначаць і звальняць суддзяў Вярхоўнага суда. Еўракамісія назвала такі стан спраў прадметам «усеагульнай заклапочанасці» і звярнулася да Варшавы з просьбай адмяніць прынятыя рашэнні. Атрымаўшы ў адказ «ігнор», ведамства пазней звярнулася ў Савет ЕС з хадайніцтвам увесці санкцыі супраць Варшавы. Аднак тады гэтая прапанова так і не была выканана.

### Глыбіня расколу

Летась у Польшчы прайшлі выбары прэзідэнта, на якіх правым на фоне пандэміі ўдалося зноў прыцягнуць свайго кандыдата. Выбар паміж дзеючым кіраўніком дзяржавы Анджэем Дудай («ПіС») і мэрам Варшавы Рафалам Тшаскоўскім («Грамадзянская кааліцыя») штабы кандыдатаў прадстаўлялі ў якасці «цывілізацыйнага супрацьстаяння». Агучаны вынік, на думку шэрагу экспертаў, вельмі сумніўны, бо відавочна выкарыстоўваліся махінацыі і падтасоўкі, нездарма выбары прызналі «бруднымі». Невыпадкова лідар «ПіС» Яраслаў Качыньскі не з'явіўся на мітынгу Дуды пасля завяршэння галасавання. Усё гэта выклікала пратэсты і спрыяла далейшаму расколу польскага грамадства, які і так надзвычай узмацніўся ў апошнія гады.

Агучаныя вынікі вызначылі расклад палітычных сіл. Дуду падтрымалі ў першую чаргу старэйшыя ўзроставыя групы: за яго прагаласавала 59,1 % выбаршчыкаў ва ўзросце 50—59 гадоў, звыш 60 гадоў — 61,7 %. Тшаскоўскага, у сваю чаргу, хацелі ўбачыць на пасадзе прэзідэнта палякі ва ўзросце 18-29 гадоў (64,4 %), 30—39 гадоў (55,4 %) і сярэдняга ўзросту — 40—49 гадоў (55,2 %). Можна зрабіць выснову, што ў дзеючага прэзідэнта і кіруючай партыі дэмаграфічна-электаральная праблема, адзначыў baltnews.lt. Колькасць іх выбаршчыкаў са зразумелых прычын наўрад ці будзе расці. Затое ў апазіцыйных сіл ёсць пэўны патэнцыял.

Палітычны выбар быў таксама прадвызначаны ўзроўнем адукацыі выбаршчыкаў. Дуда можа заручыцца падтрымкай пераважнай большасці людзей, якія маюць пачатковую (77,3 %) і пачатковую



прафесійную адукацыю (74,7 %). З невялікай перавагай ён перамог сярод уладальнікаў сярэдняй адукацыі (50,3 %). Тым часам, Тшаскоўская падтрымала 65,9 % палякаў з вышэйшай адукацыяй. Зноў можна сказаць, што больш перспектыўнай з'яўляецца выбарчая база цяперашняй апазіцыі, хоць яе складана пераканаць у неабходнасці ўдзелу ў выбарах. Аднак узровень адукацыі працягвае расці, і гэта будзе садзейнічаць падзенню рэйтынгу «ПіС».

Адметны геаграфічны расклад падтрымкі кандыдатаў. Дуда атрымаў упэўненую перамогу ў сельскіх раёнах (63,2 працэнта). Ва ўсіх астатніх перамог Тшаскоўскі. Усход і паўднёвы ўсход падтрымаў дзеючага прэзідэнта. Захад і поўнач — Тшаскоўскага. Культурныя адрозненні паміж гэтымі рэгіёнамі звязаныя з іх гісторыяй. Карта выбараў 2020 года дакладна супадае з картай падзелаў Польшчы XIX стагоддзя. Выключэнне — невялікія ўсходнія раёны з пераважна праваслаўным насельніцтвам.

Менавіта ў гэтым сэнсе можна казаць пра «цывілізацыйны» выбар, адзначыў baltnews.lt. Тыя пласты насельніцтва, якія традыцыйна знаходзяцца пад уздзеяннем каталіцкай царквы, галасуюць за неакансерватараў. Людзі, у якіх ёсць досвед наведвання іншых краін і кантактаў з суседзямі, схільныя да падтрымкі апазіцыі. Аналізуючы вынікі выбараў, аналітыкі заўважаюць, што глыбіня і маштаб расколу польскага грамадства нашмат большыя, чым калі-небудзь у мінулым.

### Вялікае няшчасце

У апошні год супярэчнасці паміж бакамі абвастрыліся, і справа ўсё ж такі дайшла да санкцый Брусэля супраць Польшчы, нават да размоў аб магчымым выхадзе краіны з ЕС. Як заўважаюць эксперты, «ПіС» паводзіць сябе так, нібыта яна таксама зацікаўлена ў тым, каб краіна апынулася ў поўнай ізаляцыі, і выбаршчыкі пачалі дзейнічаць па логіцы «акружанай крэпасці». А значыць, падтрымліваць дзеючы ўрад не таму, што ён працуе эфектыўна, а з-за страху перад уварваннем звонку (ці проста радыкальных перамен). Падзеі, якія прымушаюць казаць пра гэта, адбываюцца літаральна адна за адной.

Нефармальны лідар апазіцыі ў Польшчы — колішні старшыня Еўрасавета Дональд Туск. Паводле яго меркавання, «мы назіраем зусім не супрацьстаянне паміж ЕС і Польшчай, але паміж польскай уладай і палякамі». На мітынгу ў Гданьску горача выступіў Лех Валенса. «Тыя людзі, якія сёння ўзначальваюць дзяржаву, — гэта вялікае няшчасце для Польшчы. У нас былі розныя кіраўнікі, але яны не адабралі маральнасці, не падзялілі нас. Ніколі ніводны з іх не падзяліў народ так моцна, як гэтая ўлада», — заявіў экс-прэзідэнт, заклікаўшы збіраць подпісы пад зваротам да звяржэння ўрада.

Партал gazeta.pl ананімна паразмаўляў з адным з дэпутатаў «ПіС». Палітык прааналізаваў праблему, звязаную з інфляцыяй. «Сацыяльная, а потым і палітычныя выдаткі будуць вялізныя. Настолькі вялікія, што палякі не вытрымаюць павышэння цэн на энерганосьбіты, а мы з-за гэтага можам страціць уладу». Другі суразмоўнік ацаніў пакет антыінфляцыйных мер, кошт якога вылічваецца ў 10 мільярдаў злотых. «У мяне непераадольнае ўражанне, што захопленыя сваімі былымі поспехамі ўрадавыя піяршчыкі самі пераканалі сябе, што няма такой справы, якую яны не ў стане растлумачыць так, каб людзі яе купілі. А гэта значыць, што яны адарваліся ад рэальнасці. Бо з інфляцыяй гэта не працуе. Да іх, напэўна, не даходзіць, што ў людзей ёсць простыя спосабы праверыць тое, што адбываецца».

### Дымавая заслона

Польшча выкарыстоўвае сітуацыю з бежанцамі на граніцы як дымавую заслону ад сваіх праблем, заявіў у эфіры тэлеканала «Беларусь 1» грамадскі дзеяч таварыства «Польшча — Усход» Аляксандр Яцэк. «Я маю на ўвазе такія праблемы, як вялізная інфляцыя, праблемы ў энергетычным плане, праблемы з правасуддзем: штрафы, якія Еўрасаюз накладвае на наш урад. Вось гэтымі праблемамі раней жыла Польшча, і яны прывodзілі да таго, што знізіўся рэйтынг нашага ўрада. І вось якраз абстаноўка на граніцы — вельмі добры спосаб, каб памяняць зацікаўленасць польскага народа, нечым іншым яго заняць», — сказаў Аляксандр Яцэк.

Легенда польскай «Салідарнасці», былая падпольшчыца Данута Куронь звярнула ўвагу на «мілітарызацыю грамадскага жыцця», якая сістэматычна ўзмацняецца ў Польшчы, што прыводзіць да «зацягвання пятлі» вакол людзей. «Сказаць, што прысутнасць сілавых структур разбурае штодзённае жыццё, нічога не сказаць... Іх прысутнасць стварае ўмовы, якія пагражаюць жыццю», — заявіла Gazeta Wyborcza Данута Куронь.

Многія палякі пагаворваюць аб тым, каб назваць «ПіС», «Бяспраўе і несправядлівасць». Рэзкае падзенне папулярнасці партыі — таму сведчанне. Інстытут рынычных і сацыяльных даследаванняў апублікаваў вынікі апытання, якія паказваюць магчымую расстаноўку палітычных сіл у Польшчы. Аб гатоўнасці аддаць свой голас за аб'яднаныя сілы апазіцыі заявілі 41,3 %, а за «Аб'яднаных правых» — 36,4 %. Такі вось расклад.

**Пётр ДУНЬКО.**

## Даслоўна

### «Яны там грымнуцца»

Праведзеныя ў мінулым годзе прэзідэнцкія выбары ў Польшчы былі сфальсіфікаваныя, і прэзідэнт Анджэй Дуда насамрэч не набраў паловы галасоў. Аб гэтым Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка заявіў у інтэрв'ю генеральнаму дырэктару міжнароднага інфармацыйнага агенцтва «Россия сегодня» Дзмітрыю Кісялёву.

«Вы ж ведаеце, як перамог Дуда? Ён не набраў 50 працэнтаў галасоў, яму накруцілі», — сказаў беларускі лідар. Адказваючы на пытанне, ці сфальсіфікаваныя былі выбары, Аляксандр Лукашэнка сказаў: «Абсалютна».

Кіраўнік дзяржавы канстатаваў, што ў Польшчы цяпер моцная апазіцыя. «Цяпер Дональд Туск туды трапіў, у «Грамадзянскую платформу». Гэта «ПіС» — «Права і Справядлівасць». На чале ўлады гэты з розуму выжыўшы Качыньскі і Маравецкі, Дуда — тройца гэта. Калі апазіцыя ўзнялася пасля выбараў, некалькі тысяч галасоў — менш за працэнт — афіцыйна яму далі, каб яго прызнаць пераможцам», — сказаў ён.

Паводле слоў Прэзідэнта Беларусі, калі апазіцыя выйшла на вуліцы, «амерыканцы тупнулі: стоп, няхай пабудуць, наступныя вы». «Польшча знаходзіцца пад знешнім кіраўніцтвам яшчэ больш, чым Украіна, толькі яны не «пыляць», яны робяць гэта ціха, спакойна. Таму там вялікая частка грамадства не хоча бойкі з Беларуссю. Яны ад нас нічога дрэннага не бачылі. Яны адумаліся сёння, ачухаліся, і яны бачаць, што адбываецца і хто ў гэтым вінаваты», — адзначыў беларускі лідар.

«З прыходам Туска, а гэта моцны палітык, яны там грымнуцца, — упэўнены кіраўнік дзяржавы. — Там ёсць з кім размаўляць, там будзе з кім размаўляць, палякі няпросты народ — яны прымусяць любога палітыка рабіць тое, што ім выгадна».

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

## ОАО «Управляющая компания холдинга «ГОРИЗОНТ» проводит открытый аукцион по продаже недвижимого имущества, находящегося в собственности ОАО «БЭЛЗ»

Аукцион проводится в соответствии с действующим законодательством и Положением ОАО «Управляющая компания холдинга «ГОРИЗОНТ» «О порядке организации и проведения аукционов по продаже капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей»

| ЛОТ № 1 | |
|---|---|
| ЛОТ № 1 | **Капитальное строение с инв. № 100/С-45002, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Брест, ул. Московская, 204. Площадь – 3337 кв. м. Наименование – базисный склад. Назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 140100000001003336, площадью 16,3545 га, предоставленного ОАО «БЭЛЗ» на праве аренды (срок действия: по 22.08.2046).**<br>Объект недвижимости обременен договорами аренды, ипотека.<br>На земельном участке установлены следующие ограничения:<br>охранная зона линии электропередачи напряжением 110 кВ, площадь 0,0950 га, охранная зона систем и сооружений теплоснабжения, площадь 0,7705 га, водоохранная зона р. Мухавец, вне прибрежной полосы, площадь 16,3545 га, охранная зона сетей и сооружений газоснабжения, площадь 0,2230 га, сервитут: площадь 0,1167 га<br>Имущество имеет обременения. Продавец обязуется снять обременения до момента регистрации договора купли-продажи с покупателем |

| Начальная цена (в т. ч. НДС 20 %), BYN | 1 009 200,00 | Задаток, BYN | 302 760,00 | Шаг аукциона | 5 % |
|---|---|---|---|---|---|

| | |
|---|---|
| **Сведения о продавце / организаторе торгов, его местонахождение и контактные телефоны** | ОАО «БЭЛЗ»,<br>Республика Беларусь, 224020, г. Брест, ул. Московская, 204.<br>Тел.: +375 (162) 35-64-04. E-mail: brestlamp@brest.by |
| **Сведения о представителях Продавца** | Представитель ОАО «БЭЛЗ»<br>Масюк Олег Иванович, тел. +375 29 748 68 68 |
| **Сведения об организаторе аукциона** | ОАО «Управляющая компания холдинга «ГОРИЗОНТ»<br>220029, г. Минск, ул. Куйбышева, 35, пом. 1, тел. 8 017 284 94 32 |
| **Срок подписания договора купли-продажи** | Договор купли-продажи должен быть заключен в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня утверждения протокола о результатах аукциона |
| **Возмещение затрат на организацию и проведение аукционов** | Победитель аукциона в течение 3 (трех) календарных дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона обязан возместить организатору аукциона затраты на его организацию и проведение на основании счета, выставленного организатором аукциона, а также выплатить вознаграждение организатору аукциона в размере 2 % от цены продажи предмета аукциона на основании счета, выставленного организатором аукциона |
| **Условия оплаты** | Оплата задатка производится резидентами в белорусских рублях (нерезидентами в белорусских рублях или в долларах США по курсу НБ РБ на дату оплаты) на следующие банковские реквизиты:<br>*р/с BY78 AKBB 3012 0000 3263 3510 0000 в ОАО «АСБ Беларусбанк», код AKBBBY2X, г. Минск, ул. Куйбышева, 18. Получатель – Открытое акционерное общество «Управляющая компания холдинга «ГОРИЗОНТ». УНН 101059240, ОКПО 37392696.*<br>Если между продавцом и покупателем в течение срока, установленного для заключения договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и порядку оплаты за объект, оплата стоимости имущества должна быть произведена в течение 30 (тридцати) календарных дней со дня утверждения протокола о результатах повторного аукциона |
| **Место, дата и время приема заявлений на участие в аукционе** | Заявления на участие в аукционе и необходимые документы принимаются **до 13 декабря 2021 (включительно)** в рабочие дни с 9.00 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Куйбышева, д. 35 |
| **Место, дата и время проведения повторного аукциона** | Открытый аукцион состоится **17 декабря 2021 года** в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Куйбышева, д. 35, зал совещаний ОАО «Управляющая компания холдинга «ГОРИЗОНТ» |

Организатор аукциона после опубликования извещения о его проведении вправе в любое время без объяснения причин, но не позднее чем за 3 календарных дня до даты проведения аукциона, указанной в извещении о проведении аукциона, отказаться от его проведения

## Извещение о проведении 20 декабря 2021 года повторных торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ООО «Белика-плюс»

| **Предмет торгов (сведения о продаваемом имуществе)** | |
|---|---|
| Грузовой специальный самосвал MAZ 6501 A5 320-001 (государственный регистрационный номер АТ 0088-5; кузов (рама): Y3M6501A5D0000841; наименование (тип ТС): грузовой специальный самосвал; год выпуска (изготовления): 2013; цвет: белый; оснащение: серийное оборудование и комплектующие завода-изготовителя; разрешенная max масса, кг – 33500);<br>грузовой вагон VOLKSWAGEN CRAFTER (государственный регистрационный номер: АС 0604-5; кузов (рама): WV1ZZZSYZJ9021643; наименование (тип ТС): грузовой вагон (WAGON); год выпуска (изготовления): 2017; цвет: синий; оснащение: серийное оборудование и комплектующие завода-изготовителя; разрешенная max масса, кг – 3500);<br>грузовой специальный фургон изотермический MERCEDES-BENZ 1717 (государственный регистрационный номер: АР 5469-5; кузов (рама): WDB65241515736377; наименование (тип ТС): грузовой специальный фургон изотермический; год выпуска (изготовления): 1991; цвет: бежевый; разрешенная max масса, кг – 18000);<br>грузовой вагон MERCEDES-BENZ SPRINTER 211CDI (государственный регистрационный номер АН 1424-5; кузов (рама): WDB9026621R125452; наименование (тип ТС): грузовой вагон; год выпуска (изготовления): 2000; цвет: белый; разрешенная max масса, кг – 2950);<br>погрузчик универсальный Амкодор 342 С4 (государственный регистрационный номер ОМ-5 1758; кузов (рама): Y342C4000132029; год выпуска (изготовления): 2013; оснащение: серийное оборудование и комплектующие завода – изготовителя; двигатель: марка Д-260.1 № 126453) | |
| **Местонахождение:**<br>Минская обл.,Пуховичский р-н, Блонский с/с, район аг. Блонь | **Сумма задатка:** 200,00 бел. руб. |
| **Начальная цена:** 199 490,36 бел. руб. с учетом НДС | **Обременение:** залог |

**Продавец имущества:** общество с ограниченной ответственностью «Белика-плюс», ул. Чепика, 14, комн. 1, 222852, Минская область, Пуховичский район, п. Дружный.

**Организатор торгов:** государственное предприятие «МГЦН», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск.

**Условие торгов:** победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 2 процентов от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов.

Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ООО «Белика-плюс», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, внесшие задаток и заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по соответствующему предмету торгов, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также при необходимости иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

*Задаток перечисляется в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе, на расчетный счет № BY15 BLBB 3012 0190 3985 8300 1001 в ЦБУ № 527 ОАО «Белинвестбанк», г. Минск, БИК BLBBBY2X, получатель – государственное предприятие «МГЦН», УНП 190398583, назначение платежа – задаток для участия в аукционных торгах по продаже имущества ООО «Белика-плюс».*

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) подписывается в течение 15 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Торги проводятся **20 декабря 2021 года в 12.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов.

Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются **с 09.12.2021 по 17.12.2021** включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.30) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

**Телефоны для справок:** (017) 360-42-22 (государственное предприятие «МГЦН»); (044) 714-55-55 (ООО «Белика-плюс»).

# ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ ЗАСТРОЙЩИКА

## от 09.12.2021 г.

**Сведения о застройщике:** Общество с ограниченной ответственностью «САВАИНВЕСТСТРОЙ» (ООО «САВАИНВЕСТСТРОЙ»).

**Местонахождение:** г. Минск, пр-т Дзержинского, 23, оф. 431а.

**Режим работы:** рабочие дни: понедельника – пятница с 9.00 до 19.00, суббота – с 12.00 до 16.00, выходной день – воскресенье.

**Данные о государственной регистрации:** зарегистрировано Минским горисполкомом в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 193437713 от 30.06.2020.

**Цель проекта** – строительство объекта: «Многоэтажные жилые дома со встроенно-пристроенными объектами административно-общественного назначения и многоуровневая автостоянка на месте плоскостной в границах застройки пр-т Дзержинского – пр-т Жукова – ул. Железнодорожной – ул. Щорса. VI этап» (3-я очередь) в г. Минске с привлечением денежных средств граждан, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, путем заключения договоров создания объектов долевого строительства на жилые и нежилые помещения.

**Сведения о сроках реализации:**

Начало строительства – 25 ноября 2021 г.

Ввод объекта в эксплуатацию – 10 августа 2023 г.

**У Застройщика имеются:**

- решение Минского городского исполнительного комитета № 2164 от 22.07.2021 г. «Об изъятии и предоставлении земельных участков и разрешении строительства», предоставляющего Заказчику строительства право на строительство объекта: «Многоэтажные жилые дома со встроенно-пристроенными объектами административно-общественного назначения и многоуровневая автостоянка на месте плоскостной в границах застройки пр-т Дзержинского – пр-т Жукова – ул. Железнодорожной – ул. Щорса. VI этап» (3-я очередь);
- проектная документация, прошедшая в установленном порядке государственную экспертизу и получившая положительное заключение в РУП «Главгосстройэкспертиза» (заключение от 23.12.2013 г. № 1095-15/13, от 16.05.2014 № 302-15/14, с дополнениями от 28.03.2017 г. № 851-15/16, № 851-15/16-Д2 от 19.04.2021 г., от 07.12.2017 г. № 851-15/16-Д1;
- извещение о получении уведомления и регистрации объекта строительства, выданного Инспекцией контроля и надзора за строительством по г. Минску от 30.11.2021 № 06/411;
- договор строительного генподряда ООО «Тримиф-ИнжСтрой» № 23/11 от 23.11.2021 г.

**Местонахождение строящегося объекта:** г. Минск, проспект Дзержинского, 21.

**Характеристика объекта:**

Жилой дом № 1 является 7-секционным зданием, имеет сложную протяженную форму плана.

Этажность здания (в 3-й очереди) – Переменная. 3-я очередь состоит из трех секций, 15-этажных со стороны пр-та Дзержинского (цокольный этаж (расположены встроенные помещения), промежуточных (технический этаж, 13 жилых этажей); 13-этажных со стороны дворовой территории (встроенные помещения вследствие перепада рельефа полностью заглублены со стороны дворовой территории, вход во встроенные помещения организован со стороны пр-та Дзержинского).

Количество квартир – 153.

Конструктивная система здания Жилого дома № 1 – каркасная, представляет собой монолитный железобетонный рамно-связевой каркас, состоящий из пилонов и стен, которые объединяются в пространственную систему горизонтальными плитами перекрытий с ограждающими конструкциями из ячеисто-бетонных блоков и дополнительным утеплением монолитных участков снаружи.

Жилой дом № 1 по генплану оборудуется всеми необходимыми видами инженерных систем и оборудования согласно проектной документации (центральное водоснабжение и канализация, электроснабжение, оптоволоконный кабель связи, двухтрубная горизонтальная система отопления, вентиляция – с естественным побуждением).

Количество секций – 3 (в 3-й очереди).

Квартиры передаются со следующей отделкой:

стены – улучшенная штукатурка цементно-известковым раствором;

полы – цементно-песчаная стяжка;

окна и балконные двери – ПВХ-профиль с двойным стеклопакетом;

ограждение лоджий – ПВХ-профиль с однокамерным стеклопакетом;

двери – установка входной деревянной двери;

электромонтажные работы – черновая разводка с установкой розеток и выключателей;

сантехнические работы – без установки сантехнического оборудования за исключением унитаза, без сантехнической разводки за исключением подключения унитаза;

отопление – скрытая разводка с установкой стальных приборов отопления с термостатическим клапаном (без термостата);

приборы учета-электроэнергии, тепла, горячего и холодного водоснабжения.

нежилые помещения передаются со следующей отделкой:

полы – цементно-песчаная стяжка;

стены – штукатурка;

окна – из AL-профиля с двухкамерным стеклопакетом;

двери – входные;

система отопления и вентиляции – двухтрубная центральная система отопления, система вентиляции – вытяжная с механическим побуждением.

Электрическое освещение – распределительная и групповая сеть.

Нежилые помещения передаются без чистовой отделки.

**Для привлечения дольщиков к строительству по договорам создания объектов долевого строительства для граждан, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, предлагаются 153 квартиры, в том числе:**

1-комнатные – 49 шт;

2-комнатные – 38 шт;

3-комнатные – 66 шт.

**Стоимость 1 кв. метра** при 100 % составляет:

1) 1-комнатные квартиры – 1590 долларов США в эквиваленте в белорусских рублях по курсу НБРБ на день оплаты;

2) 2-комнатные квартиры – 1470 долларов США в эквиваленте в белорусских рублях по курсу НБРБ на день оплаты;

3) 3-комнатные квартиры – 1390 долларов США в эквиваленте в белорусских рублях по курсу НБРБ на день оплаты.

**Для заключения Договоров создания объектов долевого строительства предлагается 5 нежилых помещений. Стоимость 1 кв. метра** составляет:

1) Торговый зал № 1 – от 1800 до 1850 долларов США в эквиваленте в белорусских рублях по курсу НБРБ на день оплаты.

2) Торговый зал № 2 – от 1800 до 1850 долларов США в эквиваленте в белорусских рублях по курсу НБРБ на день оплаты.

3) Торговый зал № 3 – от 1800 до 1850 долларов США в эквиваленте в белорусских рублях по курсу НБРБ на день оплаты.

4) Торговый зал № 4 – от 1800 до 1850 долларов США в эквиваленте в белорусских рублях по курсу НБРБ на день оплаты.

5) Торговый зал № 5 – от 1800 до 1850 долларов США в эквиваленте в белорусских рублях по курсу НБРБ на день оплаты.

На предприятии действует система регулирования стоимости, зависимая от площади, этажа и условий оплаты строящего помещения.

**Перечень общего имущества жилого дома**, доля стоимости строительства которого включена в цену приобретения помещения:

1. Перечень общего имущества жилого дома, доля стоимости строительства которого включена в цену приобретения жилого помещения:

- объекты внутридомового инженерно-транспортного обеспечения: инженерные сети электро-, тепло-, водоснабжения, канализации, диспетчеризации лифтового оборудования, лифты;
- лестничные клетки, наружные лестницы, вентиляционные шахты, коридоры, места общего пользования, несущие, ограждающие ненесущие конструкции, механическое, электрическое, сантехническое и иное оборудование общедомового назначения, находящееся внутри жилых и нежилых помещений;
- доля помещения для размещения штатных работников товарищества собственников, расположенное в 1-й очереди объекта строительства (в количестве соотношения общей площади квартир 1-й очереди строительства к общей площади квартир всего жилого дома).

К общему имуществу жилого дома не относятся изолированные нежилые помещения, в том числе административные, а также иное имущество, в финансировании строительства которого не принимает участие Покупатель (Дольщик). Стоимость строительства указанных объектов не включена в цену приобретения жилого помещения и не финансируется Покупателем (Дольщиком).

2. Объекты инженерно-транспортной инфраструктуры, благоустройство придомовой территории, находящиеся за пределами наружного контура (отмостки) жилого дома, не входят в состав общего имущества жилого дома, не финансируются Покупателем, передаются Заказчиком строительства на безвозмездной основе эксплуатирующим их организациям как сумма затрат по их строительству в установленном законодательством порядке

**Условия ознакомления с информацией по проекту:** тел.: 8-017-364-39-34, VELCOM 8-029-310-44-44 г. Минск, пр-т Дзержинского, 23, оф. 431а.

09.12.2021 г.

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена
9 СНЕЖНЯ 2021 г.
ЧАЦВЕР
№ 23 (15922)
Выдаецца з 21 красавіка 1921 года

Імёны

## Мікіта ЛАЎРЭЦКІ:

# «Здымаць фільмы — маё ўнутранае «я»




**Напэўна, кожны з нас хоць некалі запісваў моманты свайго жыцця на камеру, пры гэтым уяўляючы сябе вялікім рэжысёрам і пастаноўшчыкам у адной асобе. Аднак толькі ў адзінак ёсць талент і схільнасць да работы ў сферы кінамастацтва. Адным з такіх шчасліўчыкаў стаў дваццацісямігадовы беларускі рэжысёр і кінакрытык Мікіта Лаўрэцкі, які падзяліўся з намі працэсам стварэння сваіх фільмаў і даў парады пачаткоўцам у гэтай справе.**

***— З чаго пачалося ваша захапленне кінамастацтвам?***

— Як банальна б ні гучала, але мая любоў да яго пачалася з ранняга дзяцінства. У бацькоў была відэакамера, і яны давалі з ёй «пагуляць» у рэжысёра на розных святах. Ну а я часу дарма не губляў і сапраўды здымаў сямейныя відэа, якія ў будучыні спатрэбіліся мне ў стварэнні фільма-аўтабіяграфіі «Мікіта Лаўрэцкі», але пра гэта пазней. Калі казаць пра маё першае больш асэнсаванае жаданне здымаць фільмы і развівацца ў гэтай сферы, а не проста інтуітыўна захоўваць моманты з жыцця, то гэта адбылося гадоў у дванаццаць. Тады разам з братам я зняў на тэлефон свой першы фільм у трох частках. У ім былі мантаж і цітры, кожная частка доўжылася па дзесяць хвілін. А ў чатырнаццаць гадоў, зноў жа з братам, зняў вострасюжэтны фільм. Мне здаецца, ужо тады ў маёй творчасці пачалі прасочвацца стыль і індывідуальнасць.

*(Заканчэнне на 4-й стар. «ЧЗ».)*

ШАГ на хвалі часу

# ЗАЎСЁДЫ НА СУВЯЗІ

## Без інтэрнэту, месенджараў і сацыяльных сетак. Няўжо такое магчыма?

**Ці ведаеце вы, калі з'явіўся першы тэлефон у Мінску? У 1890 годзе... А ці можаце паверыць у тое, што яшчэ адносна нядаўна (26 гадоў таму) колькасць незадаволеных заявак на ўстаноўку дамашніх тэлефонных апаратаў складала ў нашай краіне больш за 682 тысячы і людзям даводзілася чакаць сваёй чаргі нярэдка да дзесяці гадоў. Для сучасных падлеткаў такія факты — з вельмі-вельмі далёкай гісторыі, «калі нас яшчэ не было». Тым больш што многія ўжо нават з цяжкасцю могуць прыгадаць нумар свайго дамашняга тэлефона. Сёння «руліць» сотавая сувязь і інтэрнэт са шматлікімі месенджарамі для стасункаў. Між іншым, тэмай апошняй інфармацыйнай гадзіны, якая прайшла па ўсёй краіне ў рамках праекта «Школа Актыўнага Грамадзяніна», сталі дасягненні ў галіне інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій — «Гонар за Беларусь. Заўсёды на сувязі». Што было раней і што мы маем сёння...**



Ліцэісты прымералі на сябе ролю журналістаў і задавалі спікерам пытанні.

У мінскім агульнаадукацыйным ліцэі № 1 падышлі да правядзення заняткаў крэатыўна — арганізавалі «прэс-канферэнцыю», на якую запрасілі прадстаўнікоў міністэрстваў сувязі і інфарматызацыі, адукацыі, аховы здароўя, прадстаўніка праваахоўных органаў, правайдараў мабільнай сувязі і псіхолага. Ролю ўсіх спікераў, гатовых паведаміць аўдыторыі цікавыя факты на загаданую тэму, выконвалі навучэнцы дзясятых і адзінаццатых класаў фізіка-матэматычнага профілю. А іх аднакласнікі прымералі на сябе ролю «журналістаў», якія задавалі гасцям удакладняльныя пытанні.

*(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)*

У ліку найлепшых

# «Валанцёрства — ужо само па сабе ўзнагарода»

**Напярэдадні Міжнароднага дня добраахвотнікаў вызначылі імёны найлепшых валанцёраў краіны. Каля навагодняй ёлкі ў гандлёвым цэнтры «Сталіца» ў Мінску сустрэліся пераможцы рэспубліканскага конкурсу ў намінацыях «Асабісты ўклад», «Найлепшы валанцёрскі атрад», «Прамаролік» і ўпершыню — «Валанцёрская песня».**




Фота БРСМ.

Галоўныя госці і ўдзельнікі — добраахвотнікі. Нават у гэтыя хвіліны актывісты дзяжураць на граніцы і дапамагаюць тым, хто мае патрэбу ў падтрымцы. Менавіта таму БРСМ заснаваў спецыяльную прэмію «Гуманітарныя валанцёры Беларусі». Ёй узнагароджваюцца за бескарысную дапамогу бежанцам.

**Аляксандра ГАНЧАРОВА, каардынатар валанцёрскага руху «Добрае сэрца», сакратар Цэнтральнага камітэта БРСМ:**

— Валанцёрства мае вялікі патэнцыял і фарміруе актыўную пазіцыю маладога пакалення. Сёння гэты рух фактычна стаў часткай культуры маладых беларусаў, што пацвярджаюць справы і імкненні добраахвотнікаў, а таксама вынікі сацыялагічных даследаванняў. Важна, што нашы грамадскія інстытуты кансалідуюць свае намаганні ў добраахвотніцкай дзейнасці — аб'ядноўваюць хлопцаў і дзяўчат, каардынуюць іх працу, прапануюць адукацыйныя праграмы, фарміруюць валанцёрскія кампетэнцыі.

**Карына Дорутава,** уладальніца спецыяльнай прэміі «Гуманітарныя валанцёры», студэнтка Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы:

— Я працавала на граніцы ў якасці перакладчыка. Насамрэч гэта цяжка як эмацыянальна, так і фізічна, але я палічыла, што такі мой абавязак — дапамагчы знайсці агульную мову паміж усімі бакамі.

*(Заканчэнне на 3-й стар. «ЧЗ».)*

*У люстэрку статыстыкі*

# Шмат працаваць і стаць прафесіяналам...



**У беларускай моладзі дакладна сфарміравана нацыянальная і грамадзянская ідэнтычнасць. Яна мабільная, сацыяльна актыўная, нацэленая на поспех і развіццё, гатовая дамагацца сваіх мэт. Нягледзячы на выразны індывідуалізм і высокае значэнне матэрыяльнага фактару, моладзь з'яўляецца пазітыўнай часткай грамадства, «нястрачаным пакаленнем», для якога аднолькава важныя як развіццё дзяржавы, так і асабістая самарэалізацыя.**

Да такіх высноў прыйшлі ўдзельнікі круглага стала, прысвечанага абмеркаванню вынікаў даследавання «Пакаленне Z: устаноўкі і каштоўнасці сучаснай беларускай моладзі». Яго правёў у верасні бягучага года Цэнтр сацыяльна-гуманітарных даследаванняў БДЭУ па заказе Беларускага інстытута стратэгічных даследаванняў. У цэнтры ўвагі аказалася моладзь ва ўзросце ад 14 да 17 гадоў, бо менавіта гэта пакаленне будзе вызначаць у найбліжэйшай будучыні стратэгію развіцця Беларусі. Выбарка склала 2034 рэспандэнты.

Ва ўяўленнях маладых людзей «тройка» крытэрыяў іх жыццёвага поспеху выглядае наступным чынам: гэта павага людзей, моцнае здароўе і добрая сям'я. Для моладзі важна быць не як усе, не зліванца з натоўпам, адстойваць свае інтарэсы. У ліку правоў і свабод найбольшую каштоўнасць маюць валоданне і свабоднае распараджэнне маёмасцю (так лічыць 92,7 % рэспандэнтаў), магчымасць набываць тавары любога вытворцы, а таксама выказваць свае погляды. Галоўнымі жыццёвымі мэтамі пакалення Z з'яўляюцца дасягненне дзелавога поспеху, пабудова кар'еры (60,3 %), захаванне і ўмацаванне здароўя (51, 6%), стварэнне шчаслівай сям'і (49,5 %).

ТОП жыццёвых прыярытэтаў дапаўняе жаданне стаць прафесіяналам у сваёй спецыяльнасці і разбагацець. На думку маладых людзей, гарантыяй іх дабрабыту выступае адкрыццё ўласнага бізнесу (51,8 %), устаноўкі «шмат, настойліва працаваць» (48,8 %), «пастаянна вучыцца, павышаць сваю кваліфікацыю» (47,7 %).

У інтэрнэт-прасторы пакаленне Z з'яўляецца найбольш актыўнай групай. Пераважная большасць рэспандэнтаў ва ўзросце ад 14 да 17 гадоў (85,2 %) часцей за ўсё заходзіць у інтэрнэце ў сацыяльныя сеткі. Прыкметна менш запатрабаваныя ў маладых беларусаў сайты з інфармацыяй даведачнага характару, блогі і паштовыя серверы. Найбольш папулярныя сацыяльныя медыя, якія выкарыстоўваюцца беларускай моладдзю некалькі разоў на дзень, — TikTok (63,5 %), Instagram (63,4 %), «УКантакце» (60,1 %) і YouTube (58,7 %). Досыць запатрабаванымі сродкамі камунікацыі з'яўляюцца месенджары Telegram і Viber — імі штодня карыстаюцца 53,4 % і 29,1 % адпаведна. Найменш папулярныя сярод юнакоў і дзяўчат — Facebook, Likee, «Аднакласнікі» — да іх звяртаецца менш за 5 % рэспандэнтаў.

**Аналітык Беларускага інстытута стратэгічных даследаванняў Святлана АЛЕЙНІКАВА** звярнула ўвагу на адзін з самых распаўсюджаных стэрэатыпаў, што ўцягнутасць моладзі ў сацсеткі і гаджэты — тэндэнцыя негатыўная. «Гэта новы ўзровень і новае вымярэнне сацыяльных камунікацый, стасункаў, сувязяў, якія яшчэ, можа быць, не атрымалі сваёй ацэнкі і не раскрылі з-за гэтага свой патэнцыял. Таму я сказала б, што гэта хутчэй пазітыўная рыса, якая патрабуе большай увагі і асэнсавання», — падзялілася яна сваім меркаваннем.

Як заўважыла Святлана Алейнікава, феноменам беларускага грамадства можна назваць адсутнасць разрыву пакаленняў як у адносінах да каштоўнасцяў, так і да дзяржавы. «Гэта ўнікальны выпадак, калі няма славутага канфлікту бацькоў і дзяцей. Вядома, існуюць некаторыя адрозненні паміж узроставымі групамі — зразумелыя і натуральныя. У гэтым мне бачыцца менавіта сплаў пакаленняў, перадача вопыту ад старэйшага малодшаму, якое падрастае без якіх-небудзь глабальных светапоглядных канфліктаў, — падкрэсліла аналітык. — Для мяне было важным, што ў моладзі на пытанне аб ідэнтычнасці на першым месцы было атаясамліванне сябе з людзьмі той жа нацыянальнасці, з грамадзянамі Беларусі. Таксама ў моладзі высокая каштоўнасць дзяржавы, на якую ўскладаюцца вялікія чаканні і надзеі ў сувязі з забеспячэннем сваёй будучыні. У пакалення Z вельмі высокі запыт на самарэалізацыю, прызнанне і поспех. І ў гэтым плане маладыя людзі чакаюць паскоранай работы сацыяльных ліфтаў, пашырэнне магчымасцяў паспрабаваць сябе ў тых ці іншых праектах. Здаровая і буйная энергетыка моладзі мае вялікі патэнцыял, з якім трэба працаваць. Наша моладзь канструктыўная, пазітыўная і за ёй будучыня».

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

# ЗАЎСЁДЫ НА СУВЯЗІ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

З выступленняў «спецыялістаў» усе даведаліся, напрыклад, пра тое, што на 1 красавіка бягучага года ў Беларусі было ўжо 11,67 мільёна абанентаў мабільнай сувязі, што Беларусь займае 24-ю пазіцыю ў свеце па колькасці карыстальнікаў стацыянарнага шырокапалоснага доступу ў інтэрнэт: на 1 студзеня бягучага года іх колькасць дасягнула 3,25 мільёна. Колькасць абанентаў сотавай сувязі, якія карыстаюцца мабільным інтэрнэтам, — 7590 тысяч чалавек.

Амаль усе ўстановы адукацыі і аховы здароўя ў Беларусі маюць шырокапалосны доступ у інтэрнэт. Створаны і пастаянна абнаўляюцца электронныя адукацыйныя рэсурсы (вучэбныя выданні, вучэбна-метадычная дакументацыя і іншыя матэрыялы). Дзейнічае Адзіны інфармацыйна-адукацыйны рэсурс eior.by.

Установы аховы здароўя пераходзяць на выкарыстанне электронных рэцэптаў: да сістэмы падключана ўжо больш за 600 устаноў, выпісана больш за сем мільёнаў электронных рэцэптаў. Функцыянуе тэлемедыцынская сістэма па лічбавай мамаграфіі, адзіная тэлемедыцынская сістэма Мінска па лічбавай флюараграфіі.

У 2020 годзе Беларусь узнялася на 40-е месца ў рэйтынгу ААН (ён ахоплівае 193 краіны) па ўзроўні развіцця электроннага ўрада. Пунктам доступу для ўсіх карыстальнікаў электроннага ўрада з'яўляецца Адзіны партал электронных паслуг. Праз яго грамадзянам і юрыдычным асобам аказваецца 106 відаў электронных паслуг, ажыццяўляецца 36 адміністрацыйных працэдур. Стала звычайнай практыкай звяртацца па дапамогу да інтэрнэту ў вырашэнні любых пытанняў: мы можам выконваць у сеціве фінансавыя аперацыі, пераводзіць сродкі, аплачваць камунальныя паслугі і падаткі, купіць білет на цягнік ці самалёт, забраніраваць гасцініцу, не пакідаючы свайго дома. Разам з тым ёсць і адваротны бок медаля: развіццё тэлекамунікацыйных тэхналогій пацягнула рост колькасці кіберзлачынстваў. Менавіта гэта тэма выклікала ў «журналістаў» асаблівую цікавасць. «Прадстаўніка праваахоўных органаў» — дзесяцікласніца Сямёна Петракова — літаральна закідалі пытаннямі. Але ён добра падрыхтаваўся да магчымай атакі... Як і «псіхолаг» Аляксандра Шаўчук, якая звярнула ўвагу аўдыторыі на цікавыя нюансы.



**Імправізаваная прэс-канферэнцыя на тэму «Заўсёды на сувязі». У ролі спікераў — навучэнцы дзясятых і адзінаццатых класаў мінскага ліцэя № 1.**

Па словах «спецыяліста», ананімнасць у сеціве дапамагае многім выказваць свае думкі, не баючыся асуджэння ці неразумення. У інтэрнэце не трэба адразу рэагаваць на каментарый, можна падумаць, усё ўзважыць і толькі потым адказаць або праігнараваць крыўднае паведамленне. Гэта значна зніжае трывогу, якая прысутнічае пры жывых стасунках. Бо ў анлайне ад непрыемнай размовы можна проста сысці. Разам з тым камунікацыя ў сацсетках пазбаўлена эмоцый, нельга ўбачыць выраз твару чалавека, які вам піша, пачуць інтанацыі ў яго голасе, таму мы не можам быць цалкам упэўнены ў шчырасці чалавека і ёсць рызыка няправільна эмацыянальна ацаніць тое ці іншае паведамленне, асабліва калі побач з ім няма смайліка.

Людзі XXI стагоддзя прызвычаіліся атрымліваць інфармацыю маленькімі порцыямі (гэта хутка і зручна), але свабодны доступ да інфармацыі ў любы час зніжае нашу здольнасць запамінаць, да таго ж мы сталі ўжо настолькі залежныя ад інфармацыйнага патоку, што маем пастаянную патрэбу запаўняць прастору любымі навінамі, у тым ліку абсалютна пустой інфармацыяй...

Педагогі задалі дзецям два простыя пытанні: ці могуць яны пражыць без інтэрнэту і сацыяльных сетак хоць бы адзін дзень і ці адпраўлялі ў апошнія шэсць месяцаў лісты (мелася на ўвазе не электронная пошта). У аўдыторыі ўзнялося некалькі рук...

Быў сярод удзельнікаў прэс-канферэнцыі і сапраўдны госць — **намеснік дэкана факультэта інфакамунікацый БДУІР па вучэбна-метадычнай, навуковай і выхаваўчай рабоце Тацццяна ПЕЧАНЬ.** У мінскага ліцэя № 1 даўнія сяброўскія стасункі з гэтай ВНУ. Яно і зразумела, бо ў ліцэі ёсць фізіка-матэматычны профіль. Адтуль ліцэісты ідуць вучыцца часцей за ўсё або ў БДУІР, або ў БДУ. Таму і госці з універсітэта часта зазіраюць у ліцэй, а ліцэісты не прапускаюць у БДУІР прафарыентацыйныя мерапрыемствы.

Цікава, што гісторыя факультэта бярэ пачатак у 1980 годзе, калі ў ходзе рэарганізацыі структуры Мінскага радыётэхнічнага інстытута быў створаны факультэт электрасувязі. Перад ім была пастаўлена задача — палепшыць якасць падрыхтоўкі інжынераў-сувязістаў. Праз пятнаццаць гадоў факультэт электрасувязі быў рэарганізаваны ў факультэт тэлекамунікацый. Новае найменне больш поўна адлюстроўвала ўвесь спектр кірункаў, па якіх вялася падрыхтоўка спецыялістаў на факультэце. А 1 верасня 2017 года ён быў пераўтвораны ў факультэт інфакамунікацый, што зноў-такі было звязана са значным пашырэннем спектра тэхналогій і метадаў, якія выкарыстоўваюцца пры перадачы інфармацыі.

Як расказала Тацццяна Печань, сёння на факультэце рыхтуюць унікальных спецыялістаў, напрыклад, па ахове інфармацыі ў тэлекамунікацыях. Іх выпускнікі размяркоўваюцца ў Нацыянальны банк, камерцыйныя банкі, Беларускі міжбанкаўскі разліковы цэнтр, Нацыянальны цэнтр электронных паслуг, Нацыянальны цэнтр абмену трафікам, РУП «Белтэлекам», Навукова-даследчы інстытут тэхнічнай абароны інфармацыі, Дзяржаўны камітэт судовых экспертыз, на Беларускую атамную электрастанцыю, у кампаніі ПВТ і г. д.

На спецыяльнасці «Інфакамунікацыйныя тэхналогіі» (сеткі інфакамунікацый) вядзецца паглыбленая падрыхтоўка ў галіне праектавання і тэхнічнай эксплуатацыі бесправадных сетак, тэхналогій інтэрнэту рэчаў, сэнсарных і смарт-сетак, машыннага навучання, нейронавых сетак, аналізу мультымедыйных даных і гэтак далей. Не сакрэт, што за выпускнікамі БДУІР традыцыйна выстройваюцца чэргі з патэнцыяльных наймальнікаў.

«У нас восем факультэтаў. Выбірайце тое, што вам блізка, — звярнулася да ліцэістаў Тацццяна Печань. — Хачу параіць усім: развівайцеся ў розных сферах. Удзяляйце ўвагу ўсяму. Усе атрыманыя веды і навыкі каштоўныя і могуць паўплываць на вашу канкурэнтаздольнасць. Да таго ж любому работадаўцу патрэбныя супрацоўнікі, якія ўмеюць працаваць у камандзе. Гэта архіважны навык у XXI стагоддзі. Таму вучыцеся быць каманднымі гульцамі...»

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

*Далоў стэрэатыпы*

# РОМІН ЧАЎНОК

## І адроджаная закладная тэхніка

**Гаварыць могуць не толькі кнігі, бо вышыўка — гэта зашыфраванае пасланне нашых продкаў. У кожнага сімвала сваё асаблівае значэнне. Так, азбуку беларускага арнаменту стварылі ткачы з аграгарадка Семежава. Усяго 25 кіламетраў ад Капыля, і ў нас з'явілася магчымасць пазнаёміцца з унікальным рамяством, якім славяцца мясцовыя майстры.**





Традыцыям ткацтва ў Семежаве больш за 400 гадоў. Уладальнікі гэтых зямель Радзівілы заахвочвалі развіццё рамяства, тут дзейнічалі мануфактуры. А ткалі ў складанай закладной тэхніцы. І паколькі ткацкі станок у той час быў у кожнай хаце, мясцовыя жыхары пераянялі спосаб ткацтва, які сапраўды спадабаўся кожнаму.

— Ад самага заснавання гэтага мястэчка Радзівіламі ў 1582 годзе тут развіваецца ткацтва. І такі адметны яго від, як закладная тэхніка, амаль нідзе больш не сустракаецца. А менавіта ў вёсцы Семежава яна захавалася. Мы ў свой час спахапіліся: адрадзіць, каб яна не знікла. Гэта нашы традыцыі, якімі мы ганарымся, адрозніваемся ад іншых рэгіёнаў, — упэўнена **Таццяна ВОЛКАВА, народны майстар Беларусі па ткацтве, загадчыца Семежаўскага раённага цэнтра ткацтва.**

У мясцовым цэнтры ткацтва сёння займаюцца нават хлопчыкі. Уседлівасці ім не займаць. У кожнага свая любімая тэхніка. Зараз мы раскажам пра аднаго з іх.

Раман Волкаў, вучань 8 класа Семежаўскага вучэбна-педагагічнага комплексу «дзіцячы садок — сярэдняя школа» імя М. С. Высоцкага, выдатнік вучобы, удзельнік і неаднаразовы пераможца агульнашкольных і раённых творчых конкурсаў, з асаблівым задавальненнем займаецца ў раённым цэнтры ткацтва. З такім вельмі карпатлівым заняткам хлопец знаёмы яшчэ з малых гадоў, тут працуе яго мама — Таццяна Волкава, якая і прывіла любоў сыну да ткацтва.

Пачалося ўсё з дзяцінства. Маці брала яго з сабою на працу. Там было шмат цікавых рэчаў, якія вельмі вабілі хлопчыка, асабліва прыцягваў ткацкі станок. Хлопчыку было ўсяго тры гады і ён не даставаў нават да панажоў. Сядзеў на маміных каленях, яна «хадзіла» па прыладзе, а Рома «ганяў» чаўнок туды-сюды. Вось так і склаўся іх творчы дуэт. З таго часу хлопец пастаянна займаецца ў цэнтры ткацтва.

Настаўніцай з'яўляецца матуля. Яна вучыць сына ткаць на кроснах розныя рэчы, паясы «на ніту», «на дошчачках», «на бердзечку». Таксама Таццяна Мікалаеўна навучыла плесці саламяных павукоў, ляпіць пано з салёнага цеста. Кожны год дуэт удзельнічае ў розных святах і фестывалях. Свой першы дыплом Рома атрымаў у пяць гадоў як самы малодшы ўдзельнік абласнога свята конкурсу па ткацтве «Матчыны кросны».

У крамах зараз ёсць усё, што захочаш. Але да таго, што зроблена сваімі рукамі, ставішся зусім па-іншаму. У свой выраб Рома ўкладвае душу, настрой, думкі. І заўсёды вельмі прыемна глядзець на тое, што атрымалася ў выніку. Хлопец лічыць, што вельмі важна карыстацца рэчамі ручной работы, бо яны нясуць цеплыню і ўтульнасць. Гэтыя рэчы ўнікальныя.

Раман часта ўдзельнічае ў розных мерапрыемствах. Нават праводзіць майстар-класы! Напрыклад, прэзентаваў ручнік, сатканы ўласнымі рукамі, у Мінску падчас фінальных мерапрыемстваў рэспубліканскай міжканфесіянальнай акцыі «Аднаўленне святынь Беларусі — 2021». Той стаў яе сімвалам. «Вельмі прыемна, калі людзі цікавяцца і ім гэта падабаецца. Купляюць тканыя рэчы, карыстаюцца імі. Я спрабую развіваецца ў ткацкай справе. Пакуль добра не навучышся, то здаецца, што гэта вельмі складана. А як усё зразумееш — нічога складанага няма. Падчас ткацтва заўсёды з'яўляецца жаданне хутчэй выткаць выраб, каб убачыць, што атрымалася. Бо бывае і такое, што задумваеш адно, а атрымліваецца крышку па-іншаму», — прызнаецца Рома.

Што будзе ў будучыні, пакажа час. Хлопец марыць шмат аб чым. Але галоўнае, каб былі шчаслівыя родныя і наогул усе людзі. Ён яшчэ не вырашыў, якую прафесію абярэ, куды паступіць. Пакуль жа юны майстар проста стараецца добра вучыцца.

**Даніїл ХМЯЛЬНІЦКІ.**

# «Валанцёрства — ужо само па сабе ўзнагарода»




Фота БРСМ.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

**Аляксей Сабіраў,** уладальнік спецыяльнай прэміі «Гуманітарныя валанцёры», студэнт Гродзенскага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта:

— У нас там была класная каманда, мы былі разам, некаторыя вельмі шмат разоў, амаль кожны дзень ездзілі на граніцу. Далей хачу працаваць у тым жа кірунку, дапамагаць людзям.

Пераможцамі конкурсу ў намінацыі «Асабісты ўклад» сталі: вучаніца 11 класа лідскай сярэдняй школы № 1 Дзіяна Казлоўская, студэнтка трэцяга курса сацыяльна-гуманітарнага каледжа Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. А. Куляшова Марыя Лісоўская і студэнт шостага курса лячэбнага факультэта Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта Мікіта Спаткай.

— Прыемна быць у ліку пераможцаў конкурсу, гэта матывуе. Разам з тым валанцёрства — ужо само па сабе ўзнагарода. Дапамагаючы, знаёмішся з добрымі людзьмі, адчуваеш станоўчыя эмоцыі, даведваешся аб новым, — адзначае Мікіта.

У намінацыі «Найлепшы валанцёрскі атрад» перамаглі валанцёрскія атрады «Рука ў руцэ» Жамчужненскай сярэдняй школы Баранавіцкага раёна, «Вы не адны» Гомельскага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта, «Дабракі» Мясцовага дабрачыннага грамадскага аб'яднання горада Орша, «Добрае сэрца» факультэта дашкольнай адукацыі Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка.

Найлепшым у намінацыі «Прамаролік» стаў валанцёрскі атрад «Добрае сэрца» віцебскай гімназіі № 8, які прадставіў ролік «Будзь дабрэйшы». У намінацыі «Валанцёрская песня» перамагла віцебская гімназія № 3 імя А. С. Пушкіна з аўтарскай песняй «Сэрца святлу падары». Музыку да песні напісаў вучань дзясятага класа Максім Стук, словы — педагог-арганізатар Алена Лук'яненка.

**Даніїл ХМЯЛЬНІЦКІ.**

*Рука дапамогі*

# БЫЦЬ ТАМ, ДЗЕ ПАТРЭБНЫЯ

## У Віцебску створаны студэнцкі медатрад

**Прафесія ўрача заўсёды была цяжкая, а часам нават небяспечная. Асабліва каштоўнай яна з'яўляецца зараз, бо ўжо другі год нашы медработнікі бясстрашна і добрасумленна працуюць у пярэдняй складанай эпідэміялагічнай сітуацыі з-за каранавіруснай інфекцыі. На дапамогу ім прыходзяць студэнцкія атрады медыцынскіх устаноў адукацыі. Мы паразмаўлялі з удзельнікамі такога атрада пры Віцебскім дзяржаўным медыцынскім універсітэце і высветлілі, як гэта — быць на «передавой».**



Першым, з кім мы пазнаёміліся, стала камандзір атрада **Анастасія Пятрова, студэнтка пятага курса лячэбнага факультэта.**

— Я заўсёды ведала, што хачу звязаць жыццё з медыцынай. Больш за ўсё мяне прыцягвалі бальніцы і паліклінікі, там адчувала сябе ў сваёй талерцы, менавіта таму абрала для сябе лячэбны факультэт. Паступіўшы ва ўніверсітэт, стала адной з актывістак БРСМ. Уласна кажучы, у ім і даведалася аб тым, што хочуць ствараць такі атрад ад нашага ўніверсітэта. Я даўно хацела працаваць у паліклініцы, таму адразу адгукнулася на гэтую ідэю. Паколькі заўсёды задзейнічана ў розных мерапрыемствах і актыўнасцях, мяне прызначылі камандзірам атрада.

Першым абавязкам, з якім сутыкнулася Анастасія, стаў пошук каманды. Цяпер у склад атрада ўваходзяць пяць чалавек і працуе ён на базе Віцебскай гарадской цэнтральнай паліклінікі.

— Не магу сказаць, што я сутыкнулася з якімі-небудзь складанасцямі. Персанал сустрэў нас як родных, дапамагае ва ўсім. З першага дня працы не было адчування, што мы «навічкі». Студэнтаў пятага курса адправілі працаваць у прафілактычнае аддзяленне, а чацвёртага — у тэрапеўтычнае. Асабіста я знаходжуся ў першым. У мае абавязкі ўваходзіць рабіць прышчэпкі. Ну, і адказнасць пасады камандзіраніхто не адмяняў. Я, як сувязная асоба паміж атрадам і адміністрацыяй, дапамагаю вырашаць розныя пытанні і праблемы, калі такія ўзнікаюць. Наогул, ганаруся тым, што мы робім вельмі карысную справу, улічваючы тое, як складана зараз нашым калегам.

Услед за Насцяй мы знаёмімся з яе **намеснікам Дар'яй Кадушкай, студэнткай пятага курса лячэбнага факультэта.** Прафесію ўрача яна абрала свядома па прыкладзе свайго бацькі, які працуе хірургам.

— Пра студэнцкі атрад даведалася зусім выпадкова ў адной з нашых універсітэцкіх гутарак у сацыяльных сетках. Я гэтак жа, як і Насця, даўно хацела працаваць у паліклініцы, таму без роздумаў адгукнулася на паведамленне і стала членам атрада. Наогул, мы першы за пяць гадоў атрад у нашым універсітэце, таму на нас асаблівая адказнасць. Усе арганізацыйныя моманты па нашым працаўладкаванні ўзялі на сябе ўніверсітэт і БРСМ. Таму нам заставалася толькі своечасова прыйсці і добрасумленна выконваць сваю працу.

> **«Такія атрады, як наш, трэба адкрыць ва ўсіх установах адукацыі, і, мабыць, не толькі ў медыцынскай сферы».**

Калі мы спыталі пра складанасці, Дар'я, як і папярэдняя наша суразмоўніца, не змагла нічога ўспомніць. Па словах дзяўчыны, праца прыносіць ёй каласальнае задавальненне, яна адчувае сябе як дома. Адзіны нюанс, які яна выявіла для сябе, гэта складанасць сумяшчэння працы з вучобай.

Трэцім членам атрада, з якім мы пазнаёміліся, стаў адзіны хлопец у атрадзе — **Дзмітрый Уткін, студэнт чацвёртага курса лячэбнага факультэта.** У адрозненне ад папярэдніх суразмоўцаў, сферу медыцыны для сябе абраў выпадковым чынам, але, як аказалася, трапіў у самую «кропку».

— Пра тое, што збіраецца студэнцкі медыцынскі атрад, таксама даведаўся з паведамленняў у адной з універсітэцкіх гутарак. Мне якраз вельмі хацелася папрацаваць у сістэме аховы здароўя, таму вырашыў, што гэта мой шанц. Цяпер шчырую ў тэрапеўтычным аддзяленні і адчуваю сябе абсалютна ў сваім асяроддзі. Я з'яўляюся паўнавартасным членам калектыву ў паліклініцы, і гэта вельмі прыемна. Самае складанае для мяне пакуль — уклейваць аналізы ў амбулаторныя карты, але з часам наб'ю на гэта руку. Лічу, што такія атрады, як наш, трэба адкрыць ва ўсіх установах адукацыі, і, мабыць, не толькі ў медыцынскай сферы. Бо калі ёсць магчымасць задзейнічаць студэнтаў, якія жадаюць быць там, дзе яны патрэбныя, то чаму б не даць ім такую магчымасць?

**Ангеліна НОВІКАВА.**
**Фота дадзена героямі.**

SEX-БАЛЯСЫ

# А яны ўсё растуць...

**Усе памятаюць гэты колішні хіт ад Сямёна Слепакова пра «пятую кропку» Ані Кузняцовай? Ну, якая ўвесь час расце, а ў каханні ёй не шанцуе? («Што яна толькі не рабіла: пасля шасці не ела-ла-ла, на трэнажоры бегала-ла-ла, вугляводы з бялкамі не змешвала-ла-ла, у саўне суткі пацела-ла-ла, мазала мазямі цела-ла-ла...)» Дык вось, такое бывае не толькі ў песні. 24-гадовая танцорка і спявачка Бетані Лаён з Лос-Анджэлеса выдаткавала 10 тысяч долараў на аперацыю па памяншэнні грудзей, але паступова яе бюст ізноў стаў... павялічвацца. У 2019 годзе дзяўчына перайшла з пятага да трэцяга памеру. Да гэтага рашэння яе прывялі болі ў спіне, складанасць у падборы адзення і дыскамфорт падчас заняткаў танцамі. «Навакольныя ўвесь час казалі пра мае грудзі, было адчуванне, што яны — гэта ўсё, што ўва мне заўважаюць. Да таго ж бюст быў вельмі цяжкі, таму замінаў мне танцаваць. Здавалася, што я выглядаю бязглузда», — успамінае дзяўчына. («— А гэта праўда, што ўсе дзяўчаты вельмі любяць рэвалюцыйныя песні?» — «Чаму вы так думаеце?» — «Ну як жа?! «І дарогу грудзямі пракладзём сабе...»)**



Вынік аперацыі парадаваў Лаён, вось толькі з часам бюст зноў стаў расці. (Як там далей пра «пятую кропку» Ані Кузняцовай: «кармілі яе тараканамі, будзілі яе барабанамі, кідалі ў бярлогу з мядзведзямі і вось аднойчы заўважылі, што «пятая кропка» расце».) Гэта магло здарыцца ў выніку гарманальнага збою. «Праз два гады пасля аперацыі я ўсё ж прыняла свае вялікія грудзі, але не выключаю таго, што прыйдзе праз паўторную працэдуру ў будучыні», — сказала Бетані. Пластычны хірург з Нью-Ёрка доктар Дуглас Стэйнбрэх даў свой каментарый наконт сітуацыі Лаён: «Пасля памяншэння грудзей часам здараецца адваротны рост тканак. Змяненне вагі, цяжарнасць, стрэс, хвароба, а таксама ваганні ў гарманальным балансе — усё гэта можа быць прычынай здарэння з Бетані». («У наш час новае — гэта добра абклапае ботаксам старое».)

А вось вам другая гісторыя ў тэму. Двухметровая прыгожая і стройная спартсменка не можа знайсці другую палавінку з-за росту. («Выйду замуж. Пра сябе: лёгкаатлетка, прабег — 40 тысяч кіламетраў».) Былая ўдзельніца Нацыянальнай зборнай Вялікабрытаніі па таэквандо Джэйд Слэвін вядомая ва ўсім спартыўным свеце. Яна — залатая медалістка і чэмпіёнка па ўсходніх адзінаборствах. Дзяўчына з дзяцінства пакутавала ад кпінаў з прычыны свайго росту. Дзеці і падлеткі могуць быць неверагодна жорсткімі. («— Замуж яшчэ не выйшла?» — «Ды якое там замуж?! Універ трэба скончыць, кар'еру зрабіць, увогуле — цэлы свет неспазнаных магчымасцяў!» — «Не прапануюць?» — «Не...») Яны называлі яе «пудзілам» і «страшыдлам». Гэтыя высмейванні доўжыліся да таго часу, пакуль дзяўчыне не споўнілася 16 гадоў, і Джэйд, каб павысіць самаацэнку, стала мадэллю. («Як толькі сустракаеш мужчыну сваёй мары, дык ён абавязкова ці на паўгалавы ніжэйшы, ці на паўжыцця маладзейшы».) «Я ненавідзела свой рост, хацела быць такой жа, як усе дзяўчаты вакол, насіць абутак на абцасах і не чуць за спінай гэтыя перашэптванні», — дзеліцца перажываннямі Джэйд. («— Дарагая, дзе ты была?» — «Бегала». — «А чаму ў «Інстаграме» пуста?») Акрамя таго, дзяўчыне заўсёды было цяжка знайсці адзенне прыдатнага памеру. Спартыўныя перспектывы дзяўчыны рэзка пашырыліся ў 21 год, пасля таго, як яна ўвайшла ў зборную Вялікабрытаніі па таэквандо. Вось тады Джэйд пачала цаніць свой рост за тыя магчымасці, якія ён дае ёй у спорце, і перастала шкадаваць аб ім. Толькі з абраннікам ён пакуль не шанцуе... (А чым усё скончылася ў Кузняцовай: «І ведаеце, што Аня зрабіла? Інакш на жыццё зірнула-ла-ла, вырашыла пачаць усё спачатку і хутка каханне сваё сустрэла-ла-ла». Карацей, у Ані Кузняцовай падрастае дачка. Праўда, і «пятая кропка» ў яе па-ранейшаму расце...) Што тут скажаш? («Ажаніцца — не латарэя. У латарэі ў вас ёсць шанц».)

Профілі жывёл, сцэны з удзелам людзей, жаночае цела ў розных варыяцыях, адзенне ці нават звыклыя нам рэчы, такія як лямпачкі ці ахоўныя маскі... У «Інстаграме» ўсё больш папулярным становіцца акаўнт 23-гадовай мастачкі з Кот-д'Івуара Летыцыі Кай, якая стварае разнастайныя фігуры з уласных доўгіх валасоў. («— Ты нічога не заўважыў?» — «Валасы падрэзала?» — «Не!» — «Сукенка новая?» — «Не!» — «Ну, не ведаю тады...» — «Я валасы падрэзала!» — «Дык я ж адразу табе так і сказаў!» — «Ты здагадаўся, а я хацела, каб ты заўважыў!») Да таго ж проста ў сябе на галаве. У сваіх работах яна выкарыстоўвае металічны дрот, воск і штучныя пасмы. Для вырабу адной такой постаці ёй звычайна неабходна ўсяго каля 20 хвілін. («Жанчына павінна хутка рабіць тры рэчы: каптурок, салату і скандал».) Раю, пашукайце яе работы ў сецыве.

Нярэдка Летыцыя натхняецца тэматыкай фемінізму. У 2017 годзе дзяўчына выступіла супраць сексуальных дамаганняў фігурай мужчыны, які нібыта зазірае пад спадніцу жанчыне. Гэтым летам пратэставала супраць законапраекта аб забароне абортаў у ЗША. («Учора пастрыглася коратка. Муж заўважыў, але нічога не сказаў. Сёння падслухала, як звяртаецца да нашага сабакі: «Ты ведаў, што яна збіраецца зрабіць? Чаму ты адпусціў яе? Чаму не адгрыз ёй нагу?») Такая вось сіла росту... і сіла духу...

**Кастусь ХАЦЕЛАЎ-ЗМАГЕЛАЎ.**

# «Здымаць фільмы — маё ўнутранае «я»

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)**

***— Вы пачыналі сваё станаўленне, абапіраючыся на энтузіязм і прыродныя даныя, а нават не адразу пайшлі атрымліваць профільную адукацыю...***

— Гэта так, я да гэтага часу ўспрымаю сваю дзейнасць рэжысёра як частку сябе, з якой нарадзіўся, а не як прафесію. Скончыўшы дзевяць класаў, паступіў у Ліцэй Беларускага дзяржаўнага універсітэта. Вынікам маёй вучобы стаў залаты медаль, затым вырашыў атрымаць вышэйшую адукацыю ў БДУ на факультэце прыкладной матэматыкі і інфарматыкі. Як вы разумееце, гэта не вельмі звязана са сферай маіх інтарэсаў. Нягледзячы на тое, што я не лічу вышэйшую профільную адукацыю абавязковай умовай для станаўлення як прафесіянала і ведаю мноства прыкладаў вялікіх кінарэжысёраў, якія яе не маюць, прыняў для сябе рашэнне, што хачу тэарэтычна развіцца і здабыць новыя практычныя навыкі ў гэтай сферы. Таму паступіў у магістратуру Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў на кафедру менеджменту, гісторыі і тэорыі экранных мастацтваў і зараз маю ганаровае званне «магістр кіназнаўства».

***— Раскажыце, як праходзіць працэс стварэння вашых фільмаў?***

— Адразу магу сказаць, што галоўнае ў гэтай прафесіі ды і ў любой творчай, на мой погляд, — гэта не ідэя, а тое, як мы зможам яе раскрыць. Вось, напрыклад, была ў кагосьці задумка зняць фільм пра лятаючага слана. І што далей? А нічога, на этапе ўзнікнення ідэі ўся работа і спыніцца. Іншая справа, калі дадаць да яе ўжо нейкі сюжэт, скажам, пра незвычайнага сланіка, які нарадзіўся ў цырку і ніяк не мог знайсці сваё прызванне. Гэта я пра сюжэт мультфільма кампаніі Уолта Дыснея «Дамба»: тут вымалёўваецца зусім іншая карціна. Адразу сам сабой напрошваецца сцэнарый, у галаве з'яўляюцца кадры з будучага фільма, і натхненне не пакідае...

***— А пасля гэтага этапу якія наступны?***

— Калі ў галаве склалася больш-менш ясная карціна таго, што я хачу стварыць, надыходзіць момант напісання сцэнарыя. Часцей за ўсё раблю гэта сам, але ў некаторых фільмах у мяне ёсць суаўтары. Напрыклад, у аднаго з самых нашумелых — трылера «Беларускі псіхапат», які перамог у намінацыі «Найлепшы ігравы фільм» на XXII Міжнародным кінафестывалі «Лістапад», — суаўтарам з'яўлялецца Вольга Кавалёва. Я не той чалавек, які будзе прысвойваць сабе плён чужой працы, таму ўсіх суаўтараў заўсёды згадваю ў субцітрах. Калі працягваць пералік прыступак



стварэння фільма, то пасля напісання сцэнарыя праводжу кастынг, на якім падбіраю акцёраў, дарэчы, заўсёды гэтым займаюся асабіста, без усялякіх агентаў і менеджараў, як робяць многія рэжысёры. А далей ужо адбываецца непасрэдна працэс здымак і мантажу. Калі казаць пра тое, колькі часу на ўсё гэта сыходзіць, то вылучыць нават сярэдняе арыфметычнае вельмі складана. Бо таймінг стварэння фільма залежыць ад мноства фактараў: гэта фармат, хуткасць падбору акцёраў, складанасць мантажу і іншыя.

***— Ці часта сябры просяць зняцца ў вашых стужках?***

— Шчыра кажучы, сам стараюся запрашаць пераважна знаёмых людзей, бо яны ўжо ведаюць мяне ў рабоце і тое, як бачу той ці іншы эпізод. А я ў сваю чаргу разумею яшчэ да кастынгу, хто ў якую ролю з прычыны свайго характару і знешнасці найбольш удала ўпішацца і камфортна яе пражыве. Бываюць, вядома, і выключэнні, калі прыходзіцца працаваць з зусім незнаёмымі людзьмі. Хоць і іх я часцей за ўсё знаходжу праз сваіх знаёмых, удакладняючы, ці няма ў іх асяроддзі людзей з прыдатным тыпажом. Калі не ведаю, каго абраць на тую ці іншую ролю ці ў мяне ёсць некалькі варыянтаў, праводжу кастынг. Звычайна ў анлайн-фармаце па фота ў сацыяльных сетках. Гэтага этапу, як правіла, мне дастаткова.

***— Мы пагаварылі пра этапы стварэння фільма, а што наконт якасцяў самога рэжысёра: якім павінен быць чалавек гэтай прафесіі?***

— Калі жадаеце здымаць уласныя стужкі, то давядзецца спалучаць дзве супрацьлеглыя якасці. Першая — камунікабельнасць. У любым выпадку рэжысёру даводзіцца кантактаваць з артыстамі, суаўтарамі і іншымі на працягу здымачнага працэсу. Кожны чалавек унікальны, і да кожнага трэба знайсці свой падыход. Другая якасць — уменне абстрагавацца і быць інтравертам. Калі працэс здымак падыходзіць да канца, я пераходжу да мантажу. Часам гэта займае досыць шмат часу, які трэба правесці максімальна засяроджаным у поўнай адзіноце, не адцягваючы ўвагу. Калі мы гаворым не пра ўнутраныя якасці, а пра нейкія прафесійныя навыкі, то ўменне здымаць, мантаваць і іншыя тэхнічныя моманты прыходзяць з вопытам і практыкай. Галоўнае — не спыніцца на паўдарозе.

***— Якія з вашых карцін вы лічыце самымі галоўнымі ў сваёй фільмаграфіі?***

— Тут нават думаць не трэба, назва аднаго майго фільма кажа сама за сябе. Я маю на ўвазе фільм «Мікіта Лаўрэцкі», названы, уласна кажучы, у гонар мяне самога. Пра яго я ўжо трохі згадваў у самым пачатку нашай размовы. Звышзадачай кожнай маёй стужкі з'яўляецца аповед гісторыі гледачу. У гэтым фільме я распавёў гісторыю свайго жыцця на працягу шаснаццаці гадоў такім, якім яно было на самай справе: з усімі цяжкасцямі, радасцямі і праблемамі. Прагучыць, канешне, не вельмі сціпла, але для мяне «Мікіта Лаўрэцкі» з'яўляецца галоўным і ўнікальным фільмам не толькі ва ўласным спісе тварэнняў, але і ў гісторыі ўсяго кіно. Першая ўнікальнасць — гэта яго назва. Асабіста я не ведаю ні адной карціны, акрамя сваёй, названай у гонар самога рэжысёра і сцэнарыста ў адной асобе. Другое — гэта тое, што дадзены фільм практычна не запатрабаваў ад мяне ніякай рэжысёрскай работы. Большасць эпізодаў былі, як ужо казаў, знятыя мной у дзіцячым і падлеткавым узросце, і заставалася толькі правільна іх зманціраваць. Акрамя названага фільма, магу адзначыць яшчэ такія творы, як «Беларускі псіхапат», «Сашына пекла» і кароткаметражку «Некалькі сцэн з маёй дзяўчынай Волечкай Кавалёвай».

***— Чым захапляецеся ў вольны ад здымак час?***

— Я звычайны чалавек, у мяне ёсць любімая дзяўчына і сябры, мне падабаецца праводзіць час з імі. Акрамя таго, вядома ж, люблю глядзець фільмы і чытаць кнігі. Калі казаць пра іншыя заняткі ў прафесійнай дзейнасці, то, акрамя здымак, працую кінакрытыкам, пішу артыкулы ў розныя выданні. А яшчэ з'яўляюся суаўтарам комікса «Уключаючы яе імя і твар». Ну і, паколькі я творчы чалавек, заўсёды гляджу на свет скрозь аб'ектыў відэакамеры ў пошуках цікавых сюжэтаў. Бо, як я ўжо казаў, здымка фільмаў для мяне не прафесія, а маё ўнутранае «я».

**Ангеліна НОВІКАВА.**
**Фота з архіва героя публікацыі.**

ЧЫРВОНКА Чырвоная змена
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 12
ад 19 лютага 2009 года выдадзена
Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Заснавальнікі газеты —
рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»,
грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».
Дырэктар — галоўны рэдактар
КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

Адказныя за выпуск: рэдактар аддзела
Надзея НІКАЛАЕВА, рэдактар аддзела Сяргей РАСОЛЬКА.
Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом "Звязда"».
Адрас рэдакцыі: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.
Кантактныя тэлефоны: 292 44 12, 311 17 41.
e-mail: info@zviazda.by
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
ЛД №02330/0494179 ад 03.04.2009.
220013, г. Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1.
Тыраж 14.804.
Нумар падпісаны ў 19.30 8.12.2021 г.

Прыкметы часу

# КАЛОРЫІ ПАДЛІЧАНЫ...

## Правільнае харчаванне дадому: даніна модзе або клопат аб здароўі?

**Калі сфера дастаўкі гатовага харчавання перажыла бурны рост з пачаткам пандэміі, калі з офісаў вельмі многія перамясціліся ў кватэры, а паход у краму ператварыўся ў небяспечнае падарожжа, то сёння адзін з вядучых напрамкаў у гэтым сегменце — дастаўка дадому здаровага харчавання. Цяпер гэты трэнд прыйшоў і ў Беларусь.**



Ежа «для забаўкі» па-ранейшаму запатрабаваная і ў суседняй Расіі, і ў нас (зручна ж заказаць піцу або сушы на кампанію, хутка накрыць стол, калі без папярэджання завіталі госці). Але ўсё часцей сучасны спажывец звяртае ўвагу не толькі на смак і колькасць, але і на карысць свайго рацыёну.

### Як гэта працуе

Аўтарытэтнае медыцынскае выданне The Lancet апублікавала вынік трыццацігадовага даследавання брытанскіх (зразумела!) вучоных, прысвечанае ўплыву харчавання на здароўе ўсіх органаў і сістэм чалавечага арганізма. Высноваа несуцяшальная: аказваецца, сістэматычнае няправільнае харчаванне забівае хутчэй, чым нават курэнне і алкагалізм, паколькі правакуе развіццё цяжкіх хранічных захворванняў — ад сардэчна-сасудзістых да дыябету і анкалогіі. Між тым ваду на млын няправільнага харчавання ва ўсім свеце ліюць і харчовыя звычкі (смажанае і тлустае спрадвеку любілі паўсюдна, а ідэя правільнага харчавання — дастаткова малады трэнд), і даступнасць «няправільных», але смачных і сытных страў. У той час як пераход ад «смачна, сытна і звыкла» да паравых катлетак з гарнірам з брокалі часцей за ўсё не праходзіць лёгка. Патрабуецца вызначыцца з мэтай (пахудзець, набраць мышачную масу, аздаравіць арганізм), «вывучыць матчастку» (вылучыўшы з велізарнай разнастайнасці інфармацыі па дадзеным пытанні, што сапраўды карысна, а што — не больш, чым даніна модзе), распрацаваць меню, лічыць калорыі і ўзважваць прадукты (улічваючы страты пры тэрмічнай апрацоўцы), гатаваць і есці нязвыклыя стравы (і карміць імі сваіх дамашніх, якія, хутчэй за ўсё, спачатку будуць супраціўляцца). Плюс — карэкціраваць меню ў залежнасці ад атрыманых прамежкавых вынікаў. Не кожны ў стане зрабіць усё гэта, нават маючы на ўвазе такую добрую мэту, як прыгажосць і здароўе. Сэрвісы правільнага харчавання гатовыя ўзяць на сябе гэтую працу дзеля кліента — калі кліент гатовы за тое плаціць. Пакуль у нашай краіне, як і ў суседняй Расіі, сэрвісы здаровага харчавання развіваюцца толькі ў вялікіх гарадах — у маленькіх няма попыту.

Наўскідку арганізацыя сэрвісу дастаўкі правільнага харчавання — задача больш складаная за дастаўку піцы. Па факце так яно і ёсць, калі падыходзіць да пытання адказна. Неабходнае супрацоўніцтва з дыетолагамі плюс прафесійныя кухары, здольныя зрабіць карыснае смачным, пастаянны кантроль за бялкамі-тлушчамі-вугляводамі і каларыйнасцю. Але «затлумляюцца» не ўсё: часам пад дэвізам «здаровае харчаванне» вам могуць дастаўляць звычайнае сталоўскае меню (салацік, супчык, пюрэшка, катлетка), прыблізна прыкінуўшы калараж страў. Бо наўрад ці кліент у стане нешта праверыць: тут усё пабудавана на даверы. Хоць ёсць на рынку і тыя сэрвісы, што трымаюць марку і падыходзяць да пытання скрупулёзна.

У астатнім заказ здаровага харчавання практычна не адрозніваецца ад заказу піцы. Выбіраеце праграму (на адну трапезу — «пакаштаваць», на дзень, тыдзень ці месяц), аплачваеце яе і атрымліваеце збалансаванае меню па раскладзе: кожны вечар — на наступны дзень, у пранумараваных кантэйнерах.

— Рацыёны дзеляцца па каларыйнасці — ад 900 да 2400 калорый. Гэта сутачны калараж плюс збалансаванае меню па бялках, тлушчах і вугляводах, — распавядае **саўладальнік сэрвісу правільнага харчавання Oxdetox Павел ДЗЯМ'ЯНКА.** — «Крок» складае 300 калорый. На 900 калорый — тры стравы, на 1200 — чатыры, на 1500 — адпаведна, пяць і г. д. Ёсць кліенты, якія заказваюць рацыён на 3500 калорый, гэта спартсмены-бодзібілдары. Але найбольш запатрабаваны калараж — 1200.

Ці наядаешся «ПХ-дастаўкай»?

— Кліенты часцей за ўсё кажуць, што з гэтым праблемы няма, — адзначае Павел. — Спачатку ўсе баяцца застацца галоднымі. Але потым аказваецца, што рацыёну цалкам хапае, каб не адчуваць голад.

### Дзяўчаты і айцішнікі

Колькі трэба калорый кліенту, звычайна ён вырашае сам. Але калі вы прыходзіце ўпершыню, адміністратар пракансультуе вас і падлічыць ваш расход калорый у суткі. Хто кліенты такой дастаўкі? Спачатку прыдумана яна была ў першую чаргу для офісных работнікаў і прадстаўнікоў разумовай працы, якія, з аднаго боку, у курсе сацыяльных трэндаў і імкнуцца сачыць за сваім здароўем, з другога — не



заўсёды маюць дастатковую фізічную актыўнасць. Але паколькі такую паслугу ў нашай краіне з вялікай нацяжкай можна назваць бюджэтнай, то дэмакратычная па сваёй задуме навіна ў Беларусі набыла налёт элітарнасці. У сярэднім на дзень дастаўка правільнага харчавання ў Мінску абыдзецца ў 25-35 рублёў, адна страва — 5-7 рублёў. Здаецца, няшмат, але на месяц, калі харчавацца кожны дзень, выходзіць каля 700-900 рублёў на аднаго едака.

— Затое вы не ходзіце па прадукты, не марнуеце больш ні капейкі на харчаванне і не змагаецеся са спакусамі, — падкрэслівае Павел. — Акрамя таго, як правіла, з набытых прадуктаў і прыгатаваных вамі страў частка сапсуецца, скончыцца тэрмін прыдатнасці. Нашы стравы не псуюцца, іх з'ядаюць поўнасцю. Вы атрымліваеце кожны дзень свежую смачную ежу, разнастайны рацыён і вялізную эканомію часу на закупку прадуктаў і іх прыгатаванне.

Большасць кліентаў дастаўкі правільнага харчавання — гэта жанчыны ад 25 да 45 гадоў, паспяховыя і з добрай зарплатай. Мужчынская частка кліентаў — маладыя людзі, якія працуюць у сферы IT, і мужчыны на кіруючых пасадах, не абцяжараныя сям'ёй, а таксама невялікі працэнт спартсменаў. Жанчыны, як правіла, імкнуцца пахудзець. Задача «аздаравіць арганізм» у айчыннага заказчыка правільнага харчавання часам аказваецца на другім месцы, распавядаюць супрацоўнікі дастаўкі. «Але нашы кліенты страчваюць лішнюю вагу без шкоды для здароўя», кажуць яны. Атрымаецца знізіць вагу ці не — пытанне самадысцыпліны. Калі дзяўчына «даганяецца» шакаладкамі або з'ядае па два кантэйнеры за раз, а потым яшчэ і добра вячэрае па-за праграмай, наўрад ці яна пазбавіцца лішніх кілаграмаў. Адзін з галоўных аргументаў мужчын на карысць дастаўкі здаровай ежы — лянотна гатаваць, а фастфуд надакучыў і шкодны.

### Плюс-мінус

У трэнду «дастаўка ПХ» ёсць безумоўныя плюсы. Так, вырашыўшы заняцца правільным харчаваннем самастойна, вы рызыкуеце трапіцца на вуду маркетолагаў, паверыць модным дыетам і «парадам зорак», падсесці на сумніўныя харчовыя дабаўкі. І, як вынік, не толькі не аздаравіцца, а, наадварот, нанесці здароўю шкоду — елі б ужо лепш бульбу з каўбасой, як прывыклі, часам кажуць урачы. Тут дарэчы прыгадаць міфалагізацыю здаровага харчавання ў свядомасці сучаснага чалавека: у «чорны спіс» трапляюць масла, бульба і хлеб, цукар, соль і гэтак далей. Але выключыўшы нешта з рацыёну, варта нешта ў яго ўключыць, падкрэсліваюць дыетолагі — тое, што прынясе ў арганізм карысныя рэчывы, якія мы недаатрымліваем (бо недахоп часам больш шкодны за лішак). Што ўключыць і ў якіх колькасцях, абывацель у курсе далёка не заўсёды. Дастаўка правільнага харчавання, прынамсі, дасць вам збалансаваны рацыён, дзе прысутнічаюць у дастатковай колькасці асноўныя неабходныя арганізму рэчывы. Акрамя таго, нават нядоўгі вопыт правільнага харчавання зменіць смакавыя звычкі і дасць уяўленне пра тое, як яшчэ можна гатаваць звыклыя прадукты. І, вядома, вы атрымліваеце вольны час. Напрыклад, некаторыя падобныя сэрвісы прапануюць у тым ліку і святочнае меню з карыснымі соусамі замест маянэзу (у навагоднім — можа прысутнічаць нават салата «Аліўе», якая не сапсуе фігуру).

Ну а галоўны мінус — гэта, вядома, кошт. Згодна з данымі Белстата, у IV квартале 2020 года грашовыя расходы ў разліку на дамашнюю гаспадарку склалі Br1414,3 на месяц, з якіх Br1063,7 (75,2 працэнта) прыпадае на спажывецкія расходы. У прыватнасці, на харчаванне — 38,6 % названай сумы.

**Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.**

# БЯСПЕЧНЫЯ АРЭЛІ

## З 1 снежня дзейнічаюць новыя патрабаванні да абсталявання для дзіцячых гульнявых пляцовак

**Як паведамілі ў прэс-службе Дзяржстандарта, тэхнічны рэгламент Еўразійскага эканамічнага саюза «Аб бяспечнасці дзіцячых гульнявых пляцовак» (ТР ЕАЭС 042/2017) устанаўлівае патрабаванні да бяспекі абсталявання і (або) пакрыцця для дзіцячых гульнявых пляцовак і звязаных з імі працэсаў праектавання, вытворчасці, мантажу, эксплуатацыі, захоўвання, перавозкі і ўтылізацыі. Дакумент уступіў у сілу 18 лістапада 2018 года, а 1 снежня скончыўся тэрмін для пераходу на яго патрабаванні.**

Тэхрэгламент распаўсюджваецца на горкі, арэлі, качалкі, каруселі, канатныя дарогі, ударапаглынальныя пакрыцці, а таксама дзіцячыя мястэчкі (гульнявыя комплексы), пясочніцы, гульнявыя домікі, лабірынты, размешчаныя на адкрытых тэрыторыях або ў закрытых памяшканнях.

Тэхрэгламент не распаўсюджваецца на абсталяванне і пакрыцці для дзіцячых гульнявых пляцовак, выраблены і ўведзеныя ў эксплуатацыю раней, чым уступіў у сілу тэхнічны рэгламент; цацкі; спартыўнае абсталяванне і вырабы, прызначаныя для трэніровак і заняткаў фізічнай культурай, спортам і турызмам; атракцыёны, на якія распаўсюджваецца дзеянне тэхрэгламенту «Аб бяспечнасці атракцыёнаў».

Абсталяванне і (або) пакрыцці дзіцячых гульнявых пляцовак, якія ўпершыню выпускаюцца ў абарот на тэрыторыі ЕАЭС з 1 снежня 2021 года, падлягаюць абавязковаму пацвярджэнню адпаведнасці патрабаванням названага тэхнічнага рэгламенту.

Горкі, арэлі, качалкі, каруселі, канатныя дарогі, дзіцячыя гарадкі (гульнявыя комплексы), ударапаглынальныя гумавыя і сінтэтычныя пакрыцці падлягаюць сертыфікацыі. Пясочніцы, гульнявыя домікі, лабірынты, а таксама ўдарапаглынальныя пакрыцці: пясчаныя, гравійныя, дзярновыя і з драблёнай драўніны — дэкларыраванню адпаведнасці.

Пасля выпуску ў абарот абсталявання і (або) пакрыцця на працягу іх прызначанага тэрміну службы ажыццяўляецца ацэнка тэхнічнага стану (тэхнічнага агляду).

Дарэчы, на кожнай пляцоўцы павінен быць устаноўлены інфармацыйны стэнд з рэкамендацыямі вытворцы па правілах эксплуатацыі абсталявання (з указаннем пераліку правілаў эксплуатацыі, узроставай групы ды іншага); тэлефонаў выкліку экстранных службаў; тэлефонаў абслуговай арганізацыі.



Таксама неабходна своечасова ажыццяўляць дэмантаж і ўтылізацыю абсталявання, якое не адпавядае патрабаванням бяспекі і (або) са скончаным тэрмінам службы.

Падрабязна азнаёміцца з ТР ЕАЭС 042/2017 можна на сайтах Еўразійскай эканамічнай камісіі і Дзяржстандарта.

**Дар'я ГАСЦІЛОВІЧ.**

# Феномен Максіма


NAD MAHIŁAJ.

Kala szlachu ŭ czystym poli
Mahiła staić;
Kruhom krucić zawirucha,
Hulaje szumić.
Na mahile adzinoka
Kalina raście;
Jaje wiecier abwiwaje,
Miacielica hnie
I nawokała mahiły
Śpiewaje—hudzić
Pra taho, chto ŭ czystym poli
Pachawany spić...

Maksím B—wicz.

Niżni-Noŭhorad.

Першы апублікаваны верш Максіма Багдановіча «Над магілай», газета «Наша Ніва» (№ 1) 1 студзеня 1909 года.

*(Заканчэнне.
Пачатак на 1-й стар.)*

Сёння Максіму Кніжніку, як ён сябе называў, 130 гадоў. Пра тое, чым адметныя асоба і плён Максіма Багдановіча, чаму яго творы актуальныя і сёння, разважаюць доктар філалагічных навук, прафесар кафедры тэорыі літаратуры Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта **Вячаслаў РАГОЙША;** паэт, намеснік дырэктара выдавецтва «Мастацкая літаратура» — галоўны рэдактар часопіса «Полымя» **Віктар ШНІП;** намеснік генеральнага дырэктара — дырэктар па навуковай рабоце, сацыякультурнай і выдавецкай дзейнасці Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі **Алесь СУША;** літаратуразнаўца, кандыдат філалагічных навук, дацэнт, складальнік і навуковы рэдактар энцыклапедыі «Максім Багдановіч» (2011) **Мікола ТРУС** і рэжысёр-аніматар, аўтар мультфільма «Максім Багдановіч» **Алена ПЯТКЕВІЧ.**

***— Чаму мы можам павучыцца ў Максіма Багдановіча?***

**Вячаслаў Рагойша:** Найперш — патрыятызму. Сапраўднаму, дзейснаму, а не галаслоўнаму. Мала казаць пра любоў да Беларусі — трэба ведаць, шанаваць, узбагачаць яе мову, культуру, гісторыю. Як гэта рабіў Багдановіч. Нібы тая пчала, наш мысляр збіраў у беларускія соты мёд з многіх кветак, у тым ліку — «з кветак чужых палёў», выпрацоўваў для Беларусі «пашпарт на інтэлігентнасць», як казаў Іван Франко. Пакутуючы з васямнаццаці гадоў ад невылечных тады сухотаў, Багдановіч страх смерці пераадолеў думкай пра неўміручасць роднай Беларусі, духоўнаму адраджэнню якой прысвяціў усё сваё жыццё.

**Віктар Шніп:** У свой час, калі мне было дванаццаць гадоў, у школе на ўроку беларускай літаратуры я пачуў, што за дзесяць кіламетраў ад нашых Пугачоў нарадзіўся Янка Купала. Тое, што Купала загінуў у 1942 годзе, я не пачуў, і таму ў тое ж лета пайшоў у Вязынку да Купалы, каб ён павучыў мяне пісаць добрыя вершы. Схадзіў у Вязынку, але да Купалы ў хату пабаяўся зайсці. І калі б на ўроку беларускай літаратуры я даведаўся, што за пятнаццаць кіламетраў ад Пугачоў у Ракуцёўшчыне жыў Максім Багдановіч, я, відаць, таксама пайшоў бы да Багдановіча. Я б не пачуў, што гэта было даўным-даўно. Я панёс бы свае вершы Максіму Багдановічу, каб ён падвучыў мяне пісаць творы пра каханне.

**Мікола Трус:** Варта павучыцца мэтанакіраванасці, цэльнай самаадданасці беларускай справе. Была ў яго і дэталёва прадуманая праграма нацыянальнага будаўніцтва, і яе паэтапнае выкананне. Многае паэт свядома, самаахвярна ўзваліў на свае ўласныя плечы. Як пісаў бацька Максіма Багдановіча, «слабогрудый, хилый, поднял этот тяжелый, кропотливый, крохоборческий труд и нес его терпеливо, упорно, для всех окружающих незаметно». Ужо для сучаснікаў, калег па пяры малады беларус, які жыў на Волзе, быў прыкладам не толькі фенаменальнага авалодання беларускай мовай удалечыні ад яе жывога гучання. Максім Багдановіч заўважна вылучаўся сярод пісьменнікаў паслядоўнай арыентацыяй сваёй творчасці на найлепшыя ўзоры сусветнага пісьменства, уважлівым і патрабавальным стаўленнем да друкаванага слова, ступенню росту нацыянальнага пісьменства. За ім — аўтарытэт старонняга крытыка, арбітра, чалавека з бездакорным мастацкім густам. Шырока вядомыя паэтычныя радкі — *«Нашто ж на зямлі // Сваркі і звадкі, боль і горыч, // Калі ўсе мы разам ляцім // Да зор?»* — гэта не толькі запавет, як мы прывыклі ўспрымаць, але і яго ўласнае жыццёвае правіла.

**Алена Пяткевіч:** Навучыцца не можам. Можам любіць і захапляцца ягонай творчасцю. Багдановіч выдатна кантактаваў з Сусветам. Паэт — празорлівец, цудатворац... Асаблівы Божы дар. Адметная ўласцівасць гэтага дару — голас душы, уменне ўлавіць і перадаць словамі незвычайныя імгненні чалавечага жыцця.

**Алесь Суша:** Максім Багдановіч — адзін з першых і найлепшых інтэлектуалаў у асэнсаванні беларускай культуры. Яго работы, найперш «Беларускае адраджэнне», а таксама іншыя — гэта вытокі беларускай культуралогіі. Багдановіч здзейсніў адну з першых спроб беларускай літаратурнай крытыкі: па-беларуску і знутры беларускай літаратуры. Для параўнання Яўхім Карскі — таксама беларус па нараджэнні, але ён тое робіць не зусім знутры — гэта такі антрапалагічны і этнаграфічны нарыс з пазіцыі высокай расійскай культуры, што вось у нас ёсць такая дробная народнасць, і давайце паглядзім, чым беларусы вылучаюцца. Багдановіч, мусіць, самы пазачасавы, самы актуальны беларускі пісьменнік. У нейкім сэнсе яго творы абганялі рэаліі беларускай літаратуры. Прыклад Багдановіча натхняе на асэнсаванне спадчыны многіх іншых творцаў, незаслужана забытых альбо недастаткова даследаваных.

***— Які твор Максіма Багдановіча вам найбольш блізкі і чаму?***

**Вячаслаў Рагойша:** Сёлета, у Год народнага адзінства, часта згадваюцца словы з верша «Я хацеў бы спаткацца з Вамі на вуліцы...»: *«Нашто ж на зямлі // Сваркі і звадкі, боль і горыч, // Калі ўсе мы разам ляцім // Да зор?»*

**Алесь Суша:** Вершы, пакладзеныя на музыку. Мне пашанцавала, бо маці мая працавала ў сферы культуры і я быў далучаны да культурнага жыцця. Нават на час перайменавання вуліцы Максіма Горкага ў вуліцу Максіма Багдановіча я ўжо добра ведаў, хто гэта такі. Плюс у той час шмат якія творы яго былі пакладзены на музыку, іх спявалі, яны сталі народнымі хітамі. І я сам, будучы дзіцем, у розных кампаніях спяваў гэтыя песні.

**Віктар Шніп:** Вершамі Максіма Багдановіча я пачаў зачытвацца толькі пасля дваццаці гадоў. У мой школьны час творчасць Багдановіча ці не вывучалася, ці я ўрок прапусціў. Не памятаю. Але калі мной быў прачытаны «Вянок», я адразу палюбіў Багдановіча. Кожны ягоны верш стаў для мяне цэлым сусветам, у якім штораз я адкрываў для сябе нешта новае. І самае галоўнае — чытаючы Багдановіча, хочацца самому пісаць. З усіх твораў паэта мне найбольш падабаецца санет «Паміж пяскоў Егіпецкай зямлі...», у якім ёсць радкі:

*Хоць зернейкі
засохшымі былі,
Усё ж такі жыццёвая
іх сіла
Збудзілася і буйна
ўскаласіла
Парой вясенняй збожжа
на раллі.*

У гэтых, здавалася б, простых радках — уся праўда жыцця. Усё жывое ў неспрыяльны для яго час замірае, але не памірае, і як толькі адыходзіць халоднае, зімняе, ажывае і квітнее. Гэты верш заўсёды дае надзею на лепшае, на добрае.

**Мікола Трус:** Вось ужо амаль тры дзесяцігоддзі, як жыццё і творчасць Максіма Багдановіча знаходзяцца для мяне ў пастаянным фокусе даследчыцкай увагі — музейнай, архіўнай, літаратуразнаўчай. Не магу сказаць, што з гэтай прычыны адчуванне непаўторнага смаку паэтычнага слова ў нечым страцілася. З задавальненнем перагортваю старонкі з добра знаёмымі тэкстамі, увесь час адкрываю для сябе нешта новае. Многія мерапрыемствы ў наш час актыўна пераносяцца ў сеткавую прастору. Гэта было ўлічана пры правядзенні ў 2016 годзе міжнароднай культурнай акцыі «Максім Багдановіч на мовах народаў свету», звязанай з перакладам верлібра «Я хацеў бы спаткацца з Вамі на вуліцы...» Аўтарам ідэі і мадэратарам выступіў ваш пакорны слуга. Асноўную медыйную падтрымку ўзяў на сябе Выдавецкі дом «Звязда». У выніку Багдановічаў твор загучаў на мовах усіх кантынентаў, а ўдзел узялі перакладчыкі велізарнай статуснай амплітуды: ад школьнікаў і студэнтаў да міністраў і паслоў замежных краін.



Пасля адкрыцця помніка Максіму Багдановічу 9 снежня 1981 года. Янка Саламевіч, Генадзь Шупенька, Іван Шамякін, Таццяна Кабржыцкая, Вячаслаў Рагойша.

**Алена Пяткевіч:** Зборнік паэзіі Максіма Багдановіча «Вянок» — гэта сузіранне дабрыні чалавечага сэрца. Ён абуджае жаданне глыбока, пранікліва любіць.

***— Якія адкрыцці наконт асобы і творчасці Максіма Багдановіча вам удалося зрабіць?***

**Вячаслаў Рагойша:** Распачалася мая работа яшчэ ў 60-х гадах мінулага стагоддзя, калі і доступ да самых сховішчаў быў абмежаваны, і апісанні іх былі няпоўныя ці зусім адсутнічалі, а сучасная алічбоўка дакументаў і ў сне не снілася... Асобныя свае знаходкі я апісваў у перыёдыцы. З часам з тых публікацый склалася кніжка «Вяршыні. З невядомага і забытага пра Янку Купалу, Якуба Коласа, Максіма Багдановіча», якая выйшла ў выдавецтве «Універсітэцкае» ў 1991 годзе. У кніжку ўвайшло адшуканае мной у тагачасных архівах. У Цэнтральным дзяржаўным архіве літаратуры і мастацтва СССР — пра першыя пераклады на рускую мову вершаў Максіма Багдановіча «Возера» і «Сэрца ные, сэрца кроіцца ад болю...», што належалі вядомаму ў свой час гісторыку літаратуры, перакладчыку і крытыку Чашыхіну-Вятрынскаму. У Дзяржаўным архіве-музеі літаратуры і мастацтва БССР — пра ліст Багдановіча ў «Нашу Ніву» з просьбай выпісаць газету на два летнія месяцы 1909 года і дасылаць яе на адрас: Ялта, Аутка, дача «Шалаш». У рукапісным аддзеле Цэнтральнай навуковай бібліятэкі АН УССР у Кіеве — пра рукапіс вядомага артыкула «Краса и сила (Опыт исследования стиха Т. Г. Шевченко)», з якога рабіўся друкарскі набор для маскоўскага часопіса «Украинская жизнь».

Галоўнае, што тады адшукалася ў Музеі музычнай культуры імя М. І. Глінкі ў Маскве, — матэрыялы, звязаныя з публікацыяй у часопісе «Музыка» ў 1915 годзе артыкулаў І. Глебава (псеўданім Барыса Асаф'ева) «О романтической сущности творчества Мусоргского, попутно вообще о романтизме, все — в пределах полемического ответа эпигону «передвижничества» і Максіма Багдановіча «Об интересном мнении г. Глебова». Максім смела ўступіў у спрэчку з самім Асаф'евым, тады ўжо прызнаным музыказнаўцам, кампазітарам, у будучым — акадэмікам, народным артыстам СССР, даказваў (і даказаў!), што Мадэст Мусаргскі ў музыцы — не рамантык, а рэаліст. І хоць Асаф'еў спачатку пагардліва, нават абразліва паставіўся да свайго апанента ў лістах да рэдактара «Музыкі» Дзержаноўскага («эпигон «передвижничества», «письмо его, откровенно говоря, глупое» і г. д.), пазней вымушаны быў карэнным чынам перагледзець сваю ранейшую ацэнку Мусаргскага. Больш за тое, тая спрэчка, відавочна, падказала яму вызначэнне музыкі як інтанаванага сэнсу, а інтанацыі — як выяўлення думкі ў музыцы, стрыжань яго тэорыі інтанацыі. Адшуканыя ж музейныя матэрыялы дазволілі мне напісаць артыкул «Яркі дэбют Багдановіча-музыказнаўца», пакуль што (без пахвальбы) найбольш грунтоўнае і аб'ектыўнае даследаванне на гэтую тэму.

**Віктар Шніп:** У нашым выдавецтве «Мастацкая літаратура» выйшаў зборнік вершаў Максіма Багдановіча ў серыі «Народная бібліятэка». Кожны том серыі складаюць самі чытачы — з дапамогай бібліятэк мы даведваемся, якія творы яны лічаць вартымі ўключэння ў зборнік выбраных таго ці іншага класіка. Найбольш галасоў набралі такія вядомыя творы Багдановіча, як «Зорка Венера ўзышла над зямлёю» і «Слуцкія ткачыхі». Але атрымаўся і вялікі раздзел перакладаў — Максім ставіў за мэту давесці, што на беларускай мове можа прыгожа загучаць любая паэтычная форма. У ягоным перакладзе дасканала чуецца сусветная паэзія ад Авідзія да Поля Верлена, і сучаснаму чытачу гэта таксама вельмі цікава. У асобным раздзеле сабраная мастацкая проза... Нешматлікі раздзел, але для мяне стала відавочна, наколькі выдатным, магчыма, найлепшым у сваёй эпосе празаікам мог бы быць Багдановіч.

**Мікола Трус:** У часы Вялікай Айчыннай вайны страчаны архіў паэта. А гэта асноўны корпус рукапісных збораў, эпісталярнай спадчыны. Сёння кожная «драбніца» не можа не радаваць. За апошнія гады я выявіў шэраг невядомых прыжыццёвых публікацый Максіма Багдановіча, зробленых у Аўстра-Венгрыі, Расійскай імперыі, ЗША. Даруйце даследчыцкую эйфарыю, але з гэтымі адшуканымі фактамі, за кожным з якіх шмат асобных сюжэтных ліній, як пабагацела беларуская літаратурная прысутнасць у разнастайным культурным ландшафце планеты!

**Алена Пяткевіч:** Якога я адкрыла для сябе Багдановіча?.. Ён жыў з самага маленькага ўзросту ў катастрофах. Памёр рана. Але яго талент унікальны. Гэта паэтычны рэнесанс. Ён узвышае і натхняе нашчадкаў.

# Багдановіча



Варвара, Мікалай, Ганна і Рафаіл Какуевы.

**Алесь Суша:** Па-першае, мы з калегамі знайшлі адносна нядаўна адзін з новых аўтографаў пісьменніка ў нашых фондах. Думаю, што ў нейкай ступені я вінаваты таксама ў пераасэнсаванні Максіма Багдановіча як пачынальніка беларускай культуралогіі. Багдановіч нядаўна быў асэнсаваны і як аўтар, стваральнік аднаго з першых беларускіх буквароў, альбо, як іх тады называлі, лемантарыкаў. Захаваліся ўспаміны брата Максіма Паўла Багдановіча пра тое, што яшчэ жывучы ў Яраслаўлі, прыблізна каля 1911 года, Максім Багдановіч зацікавіўся стварэннем буквара. Працаваў над ім вельмі актыўна. Зрабіў ужо кніжачку, якая суправаджалася ілюстрацыямі з адмысловым дызайнам літар-буквіц. Для афармлення Багдановіч прыцягнуў братоў Какуевых, і яны зрабілі каляровыя малюнкі. На той час беларускіх каляровых буквароў яшчэ не было, гэта магла б быць шыкоўная навацыя. Другі раз паэт звярнуўся да гэтай тэмы ўжо ў час Першай сусветнай вайны, працуючы ў Мінску разам з Аркадзем Смолічам і Зоськай Верас, якія шмат увагі аддавалі беларускай адукацыі і «дзіцячым» пытанням. У нарысе «Беларускі бежанскі прытулак» і яшчэ некалькіх Багдановіч кажа пра ролю беларускамоўнай адукацыі і важнасць адкрыцця беларускіх школ. Ён наведваў прытулак для дзетак бежанцаў у Ратамцы пад Мінскам, які працаваў па-беларуску. Але ў Расійскай імперыі аж да канца яе існавання беларускія школы так і не дазволілі. Максім Багдановіч вельмі шмат зрабіў для таго, каб яны ўзніклі. У 1915—1916 гг. ён актыўна працаваў над стварэннем чытанкі разам са Смолічам і Зоськай Верас. Пра аркушы з беларускага «Лемантара» згадваў бацька пісьменніка, які знайшоў іх, калі прыехаў вырашаць пытанні адносна пахавання. Адам Ягоравіч піша, што сын жыў гэтай ідэяй, да якой не вельмі быў падрыхтаваны складам свайго характару. Бацька недаацаніў важнасць задумы свайго сына. Дакументы Максіма, якія перадаў Адам Багдановіч, захоўваліся ў Інбелкультуры ў 1920—1930-я гады ў складзе, здаецца, чатырнаццаці папак. Была і папка «Матэрыялы да беларускага «Лемантара», якая знікла з іншымі. Праўда, у 1927 годзе выйшаў «Лемантар для дарослых», аўтарамі якога былі пазначаны Сцяпан Некрашэвіч, Мікалай Байкоў і Максім Багдановіч. Хоць на той час ужо дзесяць гадоў прайшло са смерці Максіма, верагодна, што складальнікі часткова маглі выкарыстаць яго матэрыялы.

***— У чым загадка Максіма Багдановіча?***

**Вячаслаў Рагойша:** Асоба і творчасць Максіма Багдановіча часам «правакуюць» пошукі і адкрыцці іншай, не багдановічаўскай, тэматыкі. Так, дзякуючы яму нам з Таццянай Кабржыцкай пашчасціла ўпершыню разгадаць «легенду Сяргея Палуяна», сустрэцца з яго родзічамі, у тым ліку з трыма роднымі сёстрамі.

**Віктар Шніп:** У свой час загадку стварылі з так званага інтымнага дзённіка Максіма Багдановіча, ягоных запісаў пра адносіны з жанчынай. Дасюль многія сцвярджаюць, што тыя запісы нельга было абнародаваць. Але творчыя людзі не могуць не быць публічнымі. Для чытачоў усё цікава з іх жыцця. У Багдановіча няма нічога заганнага, што трэба было б хаваць ад людзей. А тым больш што ён увесь у сваіх творах. І тут хутчэй не загадка Максіма Багдановіча, а феномен Максіма Багдановіча. І ў чым ён? А ў тым, што, пражыўшы дваццаць пяць гадоў, паэт напісаў столькі класічных вершаў, колькі не напісалі многія паэты, пражыўшы па 80, а то і больш гадоў.

**Мікола Трус:** Думаецца, прычына трывалай цікавасці да загадкі тоіцца ў яе неразгаданасці. Міхась Стральцоў, хоць і назваў сваё эсэ «Загадка Багдановіча», адказы таксама не агучыў. Перад намі спосаб белетрызацыі жыцця і творчасці паэта, лагічны ў кантэксце працэсаў міфалагізацыі: Максім Багдановіч — паэт-легенда.

У сучаснай беларускай гуманітарыстыцы «загадкавасць» яшчэ не саступіла месца, напрыклад, «кодавасці» як больш навуковаму падыходу. Але абнаўленчыя тэндэнцыі відавочныя. Менавіта яны і закліканыя працаваць на «прывабнасць» Багдановіча для розных пакаленняў, асабліва — для моладзі.

**Алена Пяткевіч:** Загадка Багдановіча — глыбокая мудрасць любячага чалавека, які сумуе па сваім шчаслівым дзяцінстве, па маці, вобраз якой зліўся з яго Радзімай. Дарэчы, мой мультфільм пра Багдановіча называецца «Я тайну ў глыбіні душы хаваю».

**Алесь Суша:** Творчасць Багдановіча не мае межаў у храналагічным дыяпазоне. Яго творы нярэдка цытуюць у даследаваннях старажытнага беларускага пісьменства тысячагадовай даўнасці. Гэтаксама яны абсалютна прыдатныя для рэалій XXI стагоддзя. У Беларусі перыяд, калі працаваў Максім, быў перыядам паўстання нацыі, фарміравання нацыянальных каштоўнасцяў. Для большасці еўрапейскіх народаў гэта быў ужо пройдзены этап, ім не трэба было адстойваць права «народам звацца». І пры гэтым пачатак XX стагоддзя — гэта час мадэрнізму, пошукаў новага ў літаратурнай творчасці. Багдановіч рабіў тое ж, што ўсе беларускія дзеячы, тыя ж Колас з Купалам, але пры гэтым у адпаведнасці з найноўшымі павевамі свайго часу. У гэтым сэнсе ён абсалютна незвычайны.

***— Што яшчэ можна было б зрабіць дзеля ўшанавання яго памяці?***

**Вячаслаў Рагойша:** На ўкраінскай мове, дзякуючы Раману Лубкіўскаму, у 2002 годзе ў Львове любоўна выдадзена грунтоўная кніга «Стратим-лебідь» — па сутнасці, поўны збор твораў Максіма Багдановіча. На жаль, да гэтага часу падобнага, поўнага збору твораў Багдановіча на рускай мове не існуе. Рускі чытач, за выключэннем перакладаў выбраных вершаў аўтара «Вянка», не ведае яго прозы, навуковых артыкулаў, публіцыстыкі, эпісталярыя. Варта было б у адным з маскоўскіх выдавецтваў — магчыма, за сродкі Саюзнай дзяржавы — арганізаваць такое выданне (відаць, у двух тамах)... Дзеля ўшанавання Багдановіча многае зроблена ў Мінску: адкрыты музей паэта, устаноўлены яму помнік, адной з вуліц прысвоена яго імя... Калісьці я выказаў прапанову надаць Нацыянальнаму акадэмічнаму Вялікаму тэатру оперы і балета Беларусі імя Максіма Багдановіча і пераназваць яго імем плошчу Парыжскай Камуны, што каля тэатра. Гэта было б правільна ва ўсіх адносінах... А што да звычаю надаваць тэатрам оперы і балета імёны выдатных нацыянальных пісьменнікаў, то гэта даўняя і даволі пашыраная традыцыя. Так, імя Пушкіна тэатры носяць (або насілі) у Ніжнім Ноўгарадзе і Кішынёве, Чарнышэўскага — у Саратаве, Шаўчэнкі — у Кіеве, Франко — у Львове, Абая — у Алматы, Ахундава — у Баку, Наваі — у Ташкенце, Махтумкулі — у Ашхабадзе, Айні — у Душанбэ, Мусы Джаліля — у Казані...

**Віктар Шніп:** Для большага ўшанавання Максіма Багдановіча сёння ўжо амаль нічога і не прыдумаеш. Ён стаіць побач з Купалам і Коласам. І ніхто ўжо іх тройку не парушыць. Яна вечная, як Беларусь. Мацуючы Беларусь, мы будзем мацаваць памяць пра Багдановіча.

**Мікола Трус:** Сёння ў Беларусі пра годнае ўшанаванне памяці і папулярызацыю творчасці паэта дбаюць дзяржаўныя літаратурныя музеі — у Мінску, Гродне і Ракуцёўшчыне (Маладзечанскі раён). У свой час агучвалася ідэя стварэння падобнай памяткі ў вёсцы Вяззе Асіповіцкага раёна. Варта было б яе рэанімаваць. У гэтым населеным пункце некалькі месяцаў 1895 года правяла Марыя Апанасаўна з трыма маленькімі сынамі. Новы музей тэматычна б не дубліраваў ужо існуючыя, змог бы прыўнесці свежую плынь у культурнае жыццё рэгіёна.

**Алена Пяткевіч:** Там, дзе стаяла хата Багдановічаў у Мінску, прыбраць «наш зручны быт» (тэнісную пляцоўку і смецевыя бакі), пасадзіць бэз, шмат бэзу з Батанічнага саду, каб вока, убачыўшы яго, напаўнялася слязамі радасці...

**Алесь Суша:** «Інтымны дзённік» Максіма Багдановіча выклікаў дэбаты ў колах культурнай інтэлігенцыі, ці аддаваць яго публічнасці. З аднаго боку, ёсць пэўная мяжа. З другога, у навуковых даследаваннях мусіць аналізавацца і выходзіць на паверхню ўсё. Спробы нешта прыхаваць прыводзяць да павелічэння інтарэсу менавіта да гэтай часткі, і яна нярэдка пачынае дамінаваць па-над тым, што больш каштоўнае. Вядомыя творцы ва ўсім свеце цяпер пераасэнсоўваюцца і выступаюць у новых ролях, якія дазваляюць асучасніць іх і прыцягнуць больш цікавасць да іх асобы і творчасці. Мне падаецца, тое ж датычыцца і Максіма Багдановіча. Згаданы «Інтымны дзённік» можа фігураваць і ў культурных, і ў тэатральных ініцыятывах. Могуць выкарыстоўвацца іншыя, можа, менш папулярныя блокі творчасці паэта. Праз гэта мы не згубім Максіма. Урэшце, ён адзін з найвышэйшых у маральным і патрыятычным сэнсе прыкладаў нашай культуры. А перш за ўсё быў проста чалавек, які меў свой лёс.

Былі ў постбіяграфіі Багдановіча і складаныя перыяды, калі пра яго забываліся і рэдка згадвалі. Аднак сёння яму шанцуе. Ёсць музеі, помнік, вуліцы ў розных гарадах. Ёсць персанальная энцыклапедыя Максіма Багдановіча. Яго, на мой погляд, не стае яшчэ ў сучаснай інтэрнэтпрасторы. Не хапае паэта і ў нефармальных колах. Хай бы ствараліся ролікі ў «ЦікТоку», коміксы, дзе Багдановіч увасобіўся б у ролі героя. Пакуль гэта ёсць у абмежаванай, невялікай колькасці. Няхай было б такіх ініцыятыў больш. Інакш паэт усё больш будзе нагадваць бронзавы помнік, аддаляцца і ператварацца ў міфічную асобу. А Максім Багдановіч можа стаць героем нашага часу.

**Падрыхтавалі Алена ДРАПКО, Арына КАРПОВІЧ, Людміла РУБЛЕЎСКАЯ.**


## Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

**Предмет торгов – Лот:**
1) изолированное помещение с инвентарным номером 130/D-61492 (наименование: швейная мастерская; назначение: помещение бытового обслуживания населения), площадью 47,5 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Пинский р-н, Пинковичский с/с, д. Пинковичи, ул. Лунинецкая, 182-4;
2) изолированное помещение с инвентарным номером 130/D-61490 (наименование: аптека; назначение: помещение здравоохранения), площадью 18,4 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Пинский р-н, Пинковичский с/с, д. Пинковичи, ул. Лунинецкая, 182-1;
3) изолированное помещение с инвентарным номером 130/D-61491 (наименование: магазин; назначение: торговое помещение), площадью 378,8 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Пинский р-н, Пинковичский с/с, д. Пинковичи, ул. Лунинецкая, 182-2

| Начальная цена, руб. (с учетом НДС) | 86 184,00 | Размер задатка, руб. | 8 618,40 |
|---|---|---|---|

**Продавец:** ф-л ПМК-58 ОАО «Пинскводстрой», Брестская обл., Пинский р-н, д. Пинковичи, ул. Березовая, 3, тел./факс 80165 67 34 19.
**Организатор торгов:** Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки».
**Р/с для перечисления задатка:** р/с BY32BAPB30127866600100000000 в ОАО «Белагропромбанк» ЦБУ № 116 в г. Брест, РД по Брестской области, код банка BAPBBY2X, УНП 201028245.
**Срок заключения договора купли-продажи:** не позднее 10 рабочих дней с даты подписания протокола аукциона.
**словия оплаты:** согласно заключенному договору купли-продажи.
**Условия продажи:** без условий.
**Информация о возмещении затрат:** участник аукциона, выигравший торги, в течение 3 рабочих дней со дня проведения аукциона компенсирует расходы на проведение аукциона, включающие вознаграждение Организатора аукциона.
**Шаг аукциона:** 5 % от предыдущей названной цены.
**Обременение:** наличие действующих договоров аренды

**Аукцион состоится 24 декабря 2021 г. в 14.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325**

Сведения о документах, которые необходимо представить для участия в аукционе, правила проведения аукциона содержатся на сайте организатора аукциона www.ocenkabrest.by, также можно узнать по телефонам: 8 (0162) 40-87-01, 40-87-02

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-329 в рабочие дни с 9.00 до 17.00**

**Последний день приема заявлений – 23 декабря 2021 г. до 17.00**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению КТПУП «Универмаг «Слуцк» (продавец) проводит открытый аукцион по продаже**

## ИЗОЛИРОВАННОГО ПОМЕЩЕНИЯ

**(наименование – нежилое помещение) общей площадью 70,9 кв. м с инв. № 640/D-70035, адрес: Минская область, г. Слуцк, ул. Социалистическая, 142-61.**

Начальная цена без НДС – **66 400,00** бел. руб. (задаток 10 % от начальной цены **– 6 640,00** бел. руб.).

**Сведения о земельном участке: кадастровый номер 642500000001000431, площадь 0,1595 га, общее долевое право постоянного пользования.**

*Земельный участок имеет ограничения в использовании: водоохранная зона реки Случь, пл. 0,1595 га.*

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, ОКПО 29250255, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».**

Условия:

1. В случае отсутствия необходимости изготовления проектной документации в течение одного месяца с даты государственной регистрации перехода права собственности на недвижимое имущество проинформировать Слуцкий районный исполнительный комитет (далее – райисполком) об отсутствии необходимости получения разрешения на разработку проектной документации, проведение проектно-изыскательных работ.

2. В случае необходимости проведения работы, требующей изготовления проектной документации:

обратиться в райисполком для получения разрешения на разработку проектной документации, проведение проектно-изыскательных работ не позднее одного месяца с даты государственной регистрации перехода права собственности на недвижимое имущество;

начать разработку проектной документации, проведение проектно-изыскательных работ в течение 6 (шести) месяцев с даты получения разрешения на разработку проектной документации, проведение проектно-изыскательных работ;

согласовать с комитетом по архитектуре и строительству Минского областного исполнительного комитета предварительный проект на реконструкцию недвижимого имущества либо строительство нового с обязанностью его реализации.

3. Заключить договор купли-продажи недвижимого имущества на условиях, определенных райисполкомом.

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов (конкурсов) по продаже отдельных объектов, находящихся в государственной собственности, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 № 609 (далее – Положение 609).

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 30 (тридцати) календарных дней с даты заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

Организатор торгов имеет право отказаться от их проведения: в любое время, но не позднее чем за три дня до наступления даты проведения аукциона.

Затраты на организацию и проведение аукциона возмещает победитель торгов (покупатель) в течение 3 (трех) рабочих дней со дня их проведения. Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в Положении 609, размещенном на сайте организатора торгов **www.rlt.by.**

*Предыдущие извещения были опубликованы в газете «Звязда» от 06.08.2021, 10.09.2021, 10.11.2021.*

Аукцион состоится **24.12.2021** в **14.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **23.12.2021** до **16.00** по указанному адресу **в каб. 320.**

**Тел.: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8029) 102-21-17, (8029) 136-31-11.**
**Тел. для осмотра: (801795) 55-3-98; (8029) 348-93-25.**

УНП 600154568

# ООО «СпецРеализация»

**объявляет о проведении повторных открытых торгов в форме аукциона по продаже имущества ООО «Полоцкая трубопроводная компания»** (УНП 391461231, Витебская обл., г. Полоцк, ул. Дзержинского, 116-73), **находящегося в процедуре экономической несостоятельности (банкротства).**

***Дата и время проведения торгов*: 23 декабря 2021 года.** Начало – 10.00. Заявки принимаются с 09 декабря 2021 года по 22 декабря 2021 года.
***Место проведения торгов:*** г. Минск, просп. Победителей, 31-1, конференц-зал ОАО «Гостиница Планета».
***Организатор торгов:*** ООО «СпецРеализация» (УНП 691842036, 223060, Минская обл., Минский р-н, Новодворский с/с, д. Большое Стиклево, д. 40, корп. 2, пом. 41), тел. 8 (029) 684-71-76.
***Продавец:* ООО «Полоцкая трубопроводная компания» (УНП 391461231)** в лице антикризисного управляющего – директора Частного предприятия «Правовая компания «БелПрофКонсалт» Комса Инги Анатольевны, тел. 8 (029) 133-01-01.

| № лота | Предмет торгов | Начальная цена, рублей без учета НДС | Шаг торгов | Задаток |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Легковой автомобиль Додж караван 2000 года выпуска, рег. знак 7715ЕК-2, № кузова 2B4FP25BXYR57562 | 2 610,00 | 5 % | 5 % |
| 2 | Грузовой автомобиль МАЗ-5551А2 2008 года выпуска, рег. знак АК1850-2, № кузова Y3M5551A280001223 | 8 190,00 | 5 % | 5 % |
| 3 | Грузовой автомобиль МАЗ 5516 А5 2008 года выпуска, рег. знак АК2389-2, № кузова Y3M5516A590002605 | 21 690,00 | 5 % | 5 % |
| 4 | Экскаватор DAEWOOS 140LC-VSOLAR, рег. знак 4939 ВВ-2 | 39 060,00 | 5 % | 5 % |
| 5 | Экскаватор-погрузчик колесный NEW HOLLAND B115B 2015 года выпуска, серийный номер FNHB115BNFHH02364, рег. знак ВК-2 3748 | 119 610,00 | 5 % | 5 % |

**Для участия в торгах необходимо:**
1. В срок до 15.00 **22 декабря 2021 года** перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY98PJCB30123042861000000933 в ОАО «Приорбанк», код PJCBBY2X, УНП 691842036, получатель – ООО «СпецРеализация».
2. Подать организатору торгов в срок с даты опубликования до 15.00 22.12.2021 заявление на участие в торгах с приложением документов, перечисленных в ст. 127 Закона Республики Беларусь от 13.07.2012 № 415-З «Об экономической несостоятельности (банкротстве)».
Заявление на участие в аукционе и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 8.30 до 17.00 по адресу: Минская обл., Минский р-н, Новодворский с/с, д. Большое Стиклево, д. 40, корп. 2, пом. 41. Контактное лицо для осмотра лотов: Яскевич Дмитрий Васильевич, тел. 8 (029) 684-71-76.
3. В день проведения торгов перед их началом участники обязаны зарегистрироваться у организатора торгов и получить аукционные (конкурсные) номера в месте проведения аукциона.
Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов.
